Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714



Ян Чыквін ☞ 3




http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 22 (2716) Год LIII | Беласток, 1 чэрвеня 2008 г. | Цана 2,00 зл. (VAT 0%)

# Лаўрэаты XXVII Міжнароднага фестывалю царкоўнай музыкі „Гайнаўка-2008” (20.05-25.05 — Беласток)



*Хор сабора Нараджэння Хрыста з Рыгі (Латвія)*

У конкурсе змагаліся 22 хоры, якіх ацэньвала журы ў саставе: праф. Рамуальд Твардоўскі (старшыня), праф. Віялета Бялецкая, Мікола Гобдыч, праф. Раман Груча, праф. Павіляс Гіліс, а. Юры Шурбак.

**У катэгорыі прафесіянальных хораў:**

**Першае месца: Хор Радыё і тэлебачання Малдовы „Capella Moldova” з Кішынёва.**

Другое месца: Ліпецкі муніцыпальны камерны хор з Ліпецка (Расія) і Хор „Avedis” Армянскага тэлебачання з Арменіі; трэцяе месца: Галіцкі камерны хор з Львова (Украіна)

**У катэгорыі парафіяльных хораў:**

**Першае месца: Хор сабора Нараджэння Хрыста з Рыгі (Латвія).**

Другое месца: Дзіцячы хор „Комітас” царквы Ісуса Збавіцеля з Ісфагана (Іран) і Хор праваслаўнай парафіі св. мучаніка Дзмітрыя з Кішынёва (Малдова).

Трэцяе месца: Хор Шаўнавадскага манастыра св. Георгія з Тбілісі (Грузія) і Мужчынскі хор св. Іакова з Прэшава (Славакія).

**У катэгорыі аматарскіх свецкіх хораў:**

**Першае месца — Акадэмічны хор „Мазаіка” Дзяржаўнага музычнага вучылішча з Магілёва (Беларусь) і Камерны хор Медычнай акадэміі з Вроцлава (Польшча).**

Другое месца: Акадэмічны хор „Bel Canto” Вышэйшай школы інфарматыкі і эканоміі ТВП з Ольштына (Польшча) і Хор „Zemgale” з Елгавы (Латвія).

Трэцяе месца: Узорны дзіцячы хор „Ліра” з Мінска (Беларусь) і Акадэмічны хор Свентакшыскай палітэхнікі з Кельцаў (Польшча).

Вылучэнні: Калектыў „Vox cantabilis” з Йіркава (Чэхія), Жаночы харавы калектыў „Саратаўская палёнія” з Саратава (Расія), Жаночы камерны хор „Намысто” з Пярэмышля. Журы прызначыла ўзнагароду найлепшаму дырыжору: **Кубак старшыні Галоўнага праўлення Польскага саюза хораў і аркестраў ў Варшаве праф. Рамана Гручы атрымала Жанэта Ялфімава, дырыжор хору „Мазаіка” з Магілёва**



*Хор Радыё і тэлебачання Малдовы „Capella Moldova” з Кішынёва з салістам Валерыем Кожакару*



*Акадэмічны хор „Мазаіка” Дзяржаўнага музычнага вучылішча з Магілёва (дырыжор- лаўрэат Жанэта Ялфімава)*

**Тэкст і фота Ганны КАНДРАЦЮК**

## Уладары алімпійскіх кольцаў

☞ 2

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Гэтыя нататкі маглі з’явіцца і на дзесятай старонцы ў спартыўнай рубрыцы. Але вялікі спорт ужо даўно перастаў быць проста забавай, ён усё больш ператвараецца не толькі ў сацыяльную з’яву, але і, на жаль, у інструмент палітычных гульняў і інтрыгаў...

## Даследчык духоўнай культуры Падляшша

☞ 2

Сяргей ЧЫГРЫН

Даследаваць свой край вучуся ў Міколы Гайдука, якому 29 траўня споўнілася б 75. Але 10 гадоў яго ўжо няма сярод нас, хаця дзесяць гадоў ён мог бы яшчэ хадзіць і ездзіць па ўсёй Беласточчыне і збіраць беларускія песні, паданні, казкі, запісваць геаграфічныя назвы, звычаі, абрады, пісаць творы...

## Начная прагулка па музеях

☞ 4

Ілона КАРПЮК



## Уладзімір Цілюлька

☞ 5

Міра ЛУКША



## Дом з багатай гісторыяй

☞ 9

Пётр БАЙКО





# Уладары алімпійскіх кольцаў

*Гэтыя нататкі маглі з'явіцца і на дзесятай старонцы ў спартыўнай рубрыцы. Але вялікі спорт ужо даўно перастаў быць проста забавай, ён усё больш ператвараецца не толькі ў сацыяльную з'яву, але і, на жаль, у інструмент палітычных гульняў і інтрыгаў. З'яўляючыся з дзяцінства прыхільнікам спорту, апошнія гадоў дзесяць падчас трансляцый з кожных спаборніцтваў, я заціята хвараю супраць расійскіх каманд. Некаторыя мае сябры даводзяць (і напэўна слушна!), што можна зазлаваць толькі „за", а „супраць" нельга. Але мне здаецца, што русафобіі ў маёй пазіцыі няма. Нічога не маю супраць асобных расійскіх спартоўцаў, некаторым, такім як тэнісістка Марыя Шарапава, ці хакеіст Сяргей Фёдараў, сімпатызую. А перажываю супраць расійскіх каманд таму, што кожная іх спартовая перамога выклікае ў гэтай краіне не столькі гонар і патрыятызм, колькі чарговы прыступ шавінізму і пагардлівасці да пераможаных. Мяркую пра гэта па расійскай прэсе і інтэрнэтнай прасторы. Акрамя таго, кожная вікторыя на спартовых арэнах прыватызуецца вышэйшым кіраўніцтвам дзяржавы і мусіць служыць пацвярджэннем правільнасці дзяржаўнага курсу. Зрэшты, з апошнім тая самая сітуацыя і ў Беларусі, толькі перамог куды меней.*

*Чарговы фінал Лігі чэмпіёнаў быў ададзены на правядзенне ў Маскве. І трэба ж было такому стацца, што ў фінал разам з англійскім „Манчэстэр Юнайтэд" прабіўся яшчэ адзін клуб з туманнага Альбіёна — лонданскі „Чэлсі", уладальнікам якога з'яўляецца расійскі алігарх Раман Абрамовіч. Ён жа губернатар далёкаўсходняй Чукоткі. У той час, як былы кіраўнік нафтавай кампаніі ЮКОС Міхаіл Хадаркоўскі паводле сфабрыкаваных крымінальных спраў каторы год сядзіць у турме, Абрамовіч цешыцца сваёй улюбёнай цацкай, імя якой „Чэлсі". Кожнаму, як кажуць, сваё. Абрамовічу, які многа разоў дэманстраваў сваю адданасць пуцінскаму рэжыму, можна ўсё. Хадаркоўскаму, ці не адзінаму расійскаму буйнаму бізнесоўцу, які дапамагаў дзецям, развіваў філантрапічныя праграмы, сядзець у турме магчыма пажыццёва — за тое, што фінансава падтрымліваў недзяржаўныя арганізацыі, гаварыў пра лібералізм і грамадзянскую супольнасць. Нелаяльнасць да крамлёўскага рэжыму Хадаркоўскаму абышлася жорсткім і несправядлівым пакараннем. Перш усяго для навукі іншым.*

*Сённяшнія пуціны-абрамовічы перакананыя, што ў цяперашнім свеце за нафта- ці газадолары можна купіць усё. За кадрам для шырокай публікі засталася гісторыя пра тое, як Расія атрымала права на правядзенне зімовай алімпіяды ў Сочы. У Гватэмалу, дзе праходзіў кангрэс Міжнароднага алімпійскага камітэта, які мусіў вызначыць месца чарговай белай алімпіяды, з Расіі быў высланы адмысловы гіганцкі самалёт з цэлым лёдавым каткам, неверагоднай колькасцю напояў, чорнай ікры і іншых дэлікатэсных прысмакаў. Куды там нейкай Аўстрыі з яе заяўкай, хоць у яе ўжо былі гатовыя ўсе спартовыя аб'екты і інфраструктура. Пагулялі, карацей, чыноўнічкі-„змагары за чысціню алімпійскіх ідэалаў" на славу. І зразумела, што аддалі права на правядзенне алімпіяды расійскаму Сочы. Так што шчыра гаварыць у нашы дні пра „алімпійскі дух" здольныя толькі непапраўныя ідэалісты. Калі б члены МАК сапраўды спавядалі ідэалы, запісаныя ў Алімпійскай хартыі, ніколі б не выйграла і пекінская заяўка. Палітызацыя бліжэйшай алімпіяды ў Кітаі была непазбежнай, але міжнародныя спартовыя чыноўнікі на такія „дробязі" ўжо даўно не звяртаюць увагі.*

*Карупцыя ж у расійскім футболе дасягнула неверагодных памераў. У Еўропе хіба толькі Украіна можа параўняцца з суседкай. Гэта ў іншых краінах — Італіі, Польшчы ідуць працэсы „ачышчэння", у Англіі, здаецца, праблема прададзеных матчаў увогуле развязана. Паспрабавалі змагацца з „заразай" і ў Беларусі. Што з гэтага выйшла, чытайце на 10-й старонцы. А ў Расіі футбол і крымінал — родныя браты. Вось і свежы прыклад — днямі арыштавалі дырэктара казанскага „Рубіна" за злачынствы дзесяцігадовай даўніны. Там то ўсе такія, але гэты трапіў пад „зачыстку" таму, што яго клуб выйшаў на першае месца ў чэмпіянаце і занадта адарваўся ад маскоўскіх каманд.*

*А „Чэлсі", нягледзячы на мільёны Абрамовіча, хоць і паказаў добрую гульню, усё ж прайграў. І так хочацца, верыць, што не ўсё можна купіць у сённяшнім спорце.*

**Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ**



# Даследчык духоўнай культуры Падляшша

*Даследаваць свой край вучыся ў Міколы Гайдука, якому 29 траўня споўнілася б 75. Але 10 гадоў яго ўжо няма сярод нас, хаця дзесяць гадоў ён мог бы яшчэ хадзіць і ездзіць па ўсёй Беласточчыне і збіраць беларускія песні, паданні, казкі, запісваць геаграфічныя назвы, звычаі, абрады, пісаць творы. Давайце пагартаем „Ніву", напрыклад, за мінулыя дзесяцігоддзі і мы ўбачым творы Міколы Гайдука амаль у кожным нумары. Ён пісаў, бо ўмеў пісаць, умеў падаць усё цікава, па-новаму арыгінальна, шчыра і аб'ектыўна — ад вершаў да падручнікаў, ад краязнаўчых матэрыялаў да гістарычных даследаванняў. Ён працаваў на Беларусь, на свой народ, які жыў з ім побач і жыў на той бок мяжы, гэта значыць у нас, у Беларусі.*

*У беларускіх выдавецтвах у Міколы Гайдука выйшла кніг больш, чым на Беласточчыне. І ўсе яны неяк адна за адной з'явіліся ў 1990-х гадах. Спачатку ў Мінску свет пабачыла „Трызна" (1991), якую склалі гістарычныя апавяданні пісьменніка. Прадмову да кнігі напісаў тады Барыс Сачанка. Наогул, Мікола Гайдук ведаў амаль усіх беларускіх пісьменнікаў, з многімі сябраваў. Знаёміцца з імі ён пачаў яшчэ тады, калі вучыўся ў Белдзяржуніверсітэце. Там ён пасябраваў таксама з Барысам Сачанкам, якога таксама, на жаль, даўно няма сярод нас. У прадмоўцы Барыс Сачанка адзначыў, што творчасць Міколы Гайдука — „гэта даніна любові і павагі да роднага краю, жаданне хоць што-кольвечы зрабіць дзеля яго велічы і славы, далучыць да яго новых прыхільнікаў і шанавальнікаў".*

*Пасля „Трызны" ў Мінску выходзіць ягоны „Паратунак" — кніга гістарычных эсэ. Гэта кніга пра простых беларускіх воінаў і знакамітых князёў, пра барацьбу княстваў, пра паратунак перад крыжакамі нашэсцем. Прыгожа і ладна Мікола Гайдук апісаў у гэтым выданні вобразы Міндоўга, Давыда Гарадзенскага, Ягайлы і Вітаўта. „Зразумела, у цэнтры гэтага займальнага падарожжа пераважна мінулае так роднага і дарагога Міколу Гайдуку краю — Падляшша. Але ў ім, бы ў вялікай кроплі, бы ў чыстым люстры, добра бачыцца ўся беларуская гісторыя. Бо зямля, размешчаная паміж Бугам і Бобрай, дзе параскіданы старажытныя гарады і мястэчкі Драгічын, Бельск, Супрасль, дзе шуміць славутая Белавежская пушча і прывольна пасуцца лясныя волаты-зубры, была здаўна вельмі цесна звязана сваім гістарычным лёсам з усёй Беларуссю, доўгі час уваходзіла ў склад Літоўска-Беларускай дзяржавы", — так напісаў у прадмове да гэтай кнігі Вячаслаў Чамярыцкі. Прадмова шырая, добрая, годная. Не пабаюся гэтых слоў. Бо Мікола Гайдук заслугоўваў добрых рэцэнзій і пахвалы, таму, што ён ведаў, што піша, як піша і для каго піша свае гістарычныя вандроўкі пра далёкае мінулае Беларусі, спыняючыся на Грунвальдскай бітве 1410 года, дзе гартаваўся наш народ.*

*Мікола Гайдук любіў беларускі фальклор, асабліва песні, паданні, небыліцы Беласточчыны. Ён іх умела збіраў, запісваў. У Мінску ў 1996 і 1997 гадах зноў выходзяць дзве ягоныя кнігі — „Белавежскія былiцы і небыліцы" і „Песні Беласточчыны". Добра сказаў Сакрат Яновіч, што „Мікола Гайдук — этнограф, але і пісьменнік, пісьменнік, але і этнограф" („Тэрмапілы", 1998, с. 127). Калі літаратар добры этнограф, то ён будзе добрым гісторыкам і пісьменнікам. Мікола Гайдук — адзін з іх.*

*А колькі цудоўных артыкулаў беластоцкі літаратар і краязнавец прысвяціў дзеячам беларускай культуры! Амаль усе яны былі апублікаваныя ў „Ніве". Гэта артыкулы пра Пятруся Броўку, Ігната Дварчаніна, Уладзіміра Дубоўку, Міхася Забэйду-Сумiцкага, Янку Купалу, Леапольда Родзевіча, Максіма Танка, Генадзя Цітовіча і пра многіх іншых. Роўна паўстагоддзя назад у друку з'явіўся і яго даследчы артыкул „Адам Міцкевіч аб Беларусі і беларусах".*

*Мікола Гайдук быў заўсёды перакананы, што нашы людзі любяць заглядваць у сваё мінулае вачыма легендаў. У мінулае беларускай гісторыі я заўсёды заглядваю праз ягоныя гістарычныя кнігі. Ён быў і застаецца ў гісторыі нашай культуры як творца эпічнага складу. Эпічным спакоем, як напісала некалі Вольга Шынкарэнка, поўняцца і выдатныя кнігі Міколы Гайдука.*

**Сяргей ЧЫГРЫН**

## Вачыма еўрапейца

# Мора, наша мора...



*Неяк так дзіўна складваецца, што Падляшша хіліцца да Балтыйскага мора. Прынамсі так можна меркаваць па выніках дзеянняў самаўрадавых ваяводскіх улад. Вось апошнім часам падляшская ўправа запрапанавала радным, каб наш рэгіён падключыўся да праекта „Кулінарны шлях Балтыйскага мора".*

*— Гэты праект рэалізуецца рэгіёнамі краін распаложаных над Балтыкай, значыць, Літвой, Латвіяй, Эстоніяй, Польшчай і Нямеччынай, — тлумачыла мне выконваючая абавязкі дырэктара дэпартамента развіцця сельскіх абшараў Падляшскай маршалкоўскай управы Альжбета Філіповіч: — Ініцыятыва выйшла з боку Эстоніі, а каардынатарам з'яўляецца Вармінска-Мазурскае ваяводства.*

*— Гэта нейкая бязглуздзіца. Наша кухня не мае нічога супольнага з прыбалтыйскай кулінарнай традыцыяй, ну, хіба што спосабы мачэння селядцоў, — прабаваў жартаваць Андрэй Федарук, вядомы беластоцкі майстар кухні, аўтар кулінарных кніжак, шэф Згуртавання „Dorzecze", з якім, падчас лозунг „Кулінарны шлях Балтыйскага мора" ў падляшскім кантэксце, я нават пагадзіўся.*

*Пасля, аднак, я пачаў сумнявацца ў сваіх сумненнях. У размове з дырэктар Філіповіч я стаў распытваць, што паўплывала на рашэнне аб уключэнні ў гэты праект:*

*— Мы распаложаны на транзітным шляху на Балтыйскае мора. У сувязі з гэтым можам выкарыстаць гэтае распаложэнне ў рамках гэтага праекта на прамоцыю нашага турызму, якога неад'емнай часткай з'яўляецца кухня, прытым на Падляшшы вельмі разнастайная.*

*І пэўна мае рацыю пані Філіповіч, прымаючы пад увагу тое, што ў гэтым выпадку скурка вартая вычынкі прынамсі па прамацыйных і фінансавых прычынах. На працягу трох гадоў (лічыўшы ад будучага года) уклад Падляшша, звязаны з удзелам у гэтым праекце, мае скласці толькі 18 тысяч еўра.*

*Пры нагодзе задумы з „Кулінарным шляхам Балтыйскага мора" прыгадалася мне атмасфера, якая ў 2001-2002 гадах спадарожнічала далучэнню Падляшша (па ініцыятыве кіруючай у той час АВС) да Канферэнцыі перыферыйных марскіх рэгіёнаў Еўропы (CPMR). Гэтую ідэю высмейвалі ва ўсёй Польшчы, а ў Лодзі „ўзнагароджана" яна была „Залатым унітазам" за найбольш абсурдную ініцыятыву ўлад. Рашыў я, вось, бышчам пры нагодзе чарговай прыморскай ініцыятывы, праверыць, што ж дагэтуль вынікла з членства ў CPMR. І вось аж дзіўна: ёсць станоўчыя вынікі! Магдалена Лыжніцка-Санчэнка, выконваючая абавязкі дырэктара дэпартамента супрацоўніцтва з замежжам і развіцця Падляшскай маршалкоўскай управы, сказала:*

*— Прашу прыняць пад увагу тое, што маем усе камунікацыйныя спалучэнні з прыбалтыйскім краінамі. Рэгіёны CPMR рашыліся, напрыклад, на супрацоўніцтва над супольнымі праектамі ў галіне авіятранспарту. Аказалася, што будзем мець нагоду прафінансаваць рапарт уплыву на асяроддзе нашага рэгіянальнага аэрапорта. Ёсць у нас шанцы здабыць сродкі на яго якраз з праекта, рэалізаванага ў рамках CPMR.*

*Як сказала мне пані Лыжніцка-Санчэнка, краіны згуртаваныя ў CPMR (агулам 155 рэгіёнаў з 26 краін, некаторыя значна аддаленыя ад Балтыкі) яшчэ восенню мінулага года прынялі дэкларацыю падтрымкі для шляху Via Baltica пабудовай кальцавой дарогі вакол Аўгустова, якой падляшскі адрэзак меў бы скласці вузкую пратоку паміж дзвюма пазаеўрасаюзнымі краінамі: Расіяй (Калінінградская вобласць) і Беларуссю. Вынікаў ад удзелу Падляшша ў CPMR значна больш. Аказалася, тое, што здавалася быць смешным і абсурдным, сёння прыносіць рацыянальныя эфекты. Штосьці мне здаецца, што можа так быць і з удзелам нашага ваяводства ў „Кулінарным шляху Балтыйскага мора"!*

**Мацей ХАЛАДОЎСКІ**

*Хаця жыхары Гайнаўкі прасілі беларускага паэта расказаць пра яго творчасць і пісьменніцкі варштат, Ян Чыквін вельмі коратка спыняўся на сваёй асобе і ўмела зводзіў гутарку на творчасць іншых „белавежцаў”, звяртаючы асаблівую ўвагу на Георгія Валкавыцкага, бацьку беларускага літаратурнага руху ў Польшчы, і на тыднёвік „Ніва”, вакол якога гуртуюцца таленавітыя беларусы, здольныя пераліць на паперу свае адчуванне акружаючага свету...*

# Юбілейнае спатканне

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

Спатканне з гайнавянамі, наладжанае 16 мая ў Музеі і асяродку беларускай культуры, прафесар Ян Чыквін назваў першай сустрэчай у рамках святкавання 50-годдзя Беларускага літаратурнага аб'яднання „Белавежа”. Старшыня літаратурнай суполкі запрасіў сабраных на галоўныя юбілейныя святкаванні, якія адбудуцца 28 і 29 чэрвеня на філалагічным факультэце Універсітэта ў Беластоку. Хаця жыхары Гайнаўкі прасілі беларускага паэта расказаць пра яго творчасць і пісьменніцкі варштат, Ян Чыквін вельмі коратка спыняўся на сваёй асобе і ўмела зводзіў гутарку на творчасць іншых „белавежцаў”, звяртаючы асаблівую ўвагу на Георгія Валкавыцкага, бацьку беларускага літаратурнага руху ў Польшчы, і на тыднёвік „Ніва”, вакол якога гуртуюцца таленавітыя беларусы, здольныя пераліць на паперу свае адчуванне акружаючага свету.

— Беларусам самім Богам падараваны быў Георгій Валкавыцкі, чалавек, які быў падрыхтаваны арганізаваць беларускае літаратурнае асяроддзе. Георгій Валкавыцкі не быў угледжаны на свой пуп. Умеў заставацца ў цені і іншым беларусам адкрываць дарогу ў літаратуру, а „Ніва”, якой ён кіраваў, стала рошчынай беларускай літаратуры на Падляшшы. І гэтая работа дала цудоўны плён. З перспектывы пяцідзесяці гадоў відаць як многа зроблена, — заявіў у пачатку сустрэчы старшыня Літаб'яднання „Белавежа” Ян Чыквін. — Апошнія 50 гадоў беларусы не праспалі, ствараючы сваю прозу, паэзію і выдаючы шмат кніг, як ніякая іншая нацыянальная меншасць у Польшчы. Усе „белавежцы” аддавалі пашану роднаму, з якім сутыкаліся ад калыскі. Нашы беларускія пісьменнікі, у адрозненні ад палякаў, апісалі і засвоілі сваім беларускім словам Беласточчыну. У нашай літаратуры паказаны менталітэт нашых мясцовасцей, іх гісторыя і прыгажосць, — сказаў прафесар Ян Чыквін, затрымліваючыся перад усім на Беластоку, Крынках, Бельску-Падляшскім і Гайнаўцы.

— А калі гаварыць пра Гайнаўку, дык у вас ёсць Міхась Андрасюк, які напісаў знакамітыя кніжкі, самая лепшая з якіх апошняя — „Белы конь”, — ацаніў прафесар Ян Чыквін. — Мы, так як і дзесяць пакаленняў перад намі, не бачым вартасці таго, што блізкае. Пасля будуць успамінаць, што ў вас быў такі Міхась Андрасюк і вы за выдатныя творы не насілі яго на руках.

І тут завязалася дыскусія.

— Андрасюк у сваіх творах крыху вядзе сябе як Шагал, а ёсць і іншыя „белавежцы”, якія бачаць Беласточчыну больш універсальна, — заявіў гайнаўскі мастак Віктар Кабац і запытаў ці творчасць літаратараў Беласточчыны можна назваць літаратурай Заходняй Беларусі.



— Ёсць такі час, што паэзія становіцца маёй і невядома адкуль і чаму з'яўляюцца нейкія словы і чалавек іх запісвае. Тады ён не кантралюе розумам таго, што з ім адбываецца ў метафізічнай прасторы, — заявіў паэт Ян Чыквін

— Я гэтага ў публікацыях не раблю. Я нават да канца не ўпэўнены, што мы ствараем літаратуру памежжа. Літаратуру Беласточчыны нельга параўнаць нават з літаратурай Падляшша, бо Падляшша гэта ўжо і польская літаратура, і ўкраінская, і іншая, — гаварыў Ян Чыквін. — Самая важная лучнасць паэзіі з акрэсленымі тэрыторыямі, у якой закранаюцца глыбейшыя працэсы, што тычацца асобнай нацыі, свайго. Калі паэты не зазямляюцца на сваёй тэрыторыі, яны гінуць. Празаік ідзе ўжо па паверхні больш агульных працэсаў.

У час сутрэчы паявілася пытанне ці літаратуру „белавежцаў” можна палічыць сусветнай.

— У шасцідзесятых ці сямідзесятых гадах гаварылася пра сусветную літаратуру. Асабліва аб гэтым напаміналася ў Савецкім Саюзе. Іншая тэорыя гаворыць, што ніякай сусветнай літаратуры не было і не будзе, а яе стварэнне гэта абстракцыя, — тлумачыў прафесар Ян Чыквін. — Усе „белавежцы” — вялікія пісьменнікі, аднак ніколі яны не лічаць сябе геніямі і паводзяць сябе як звычайныя людзі, з якімі можна спаткацца і паразмаўляць. Мы самі хочам бачыць у пісьменніках звышчалавечыя легенды, бо без гэтага цяжка нам жыць.

Моладзь пытала таксама пра варштат працы Яна Чыквіна і астатніх „белавежцаў”.



Юбілейныя кветкі старшыні літаратурнага аб'яднання „Белавежа” Яну Чыквіну ўручыла бібліятэкарка Мажэна Ціханюк

— Пішацца тады, калі хочацца. Ёсць такі час, што паэзія становіцца тваёй і невядома адкуль і чаму з'яўляюцца нейкія словы і чалавек іх запісвае. Тады ён не кантралюе розумам таго, што з ім адбываецца ў метафізічнай прасторы, — адказаў паэт Ян Чыквін. — Ёсць такія месцы, дзе працуецца найлепш. У кожнай асобы ёсць свой куточак, у якім натхненне прыходзіць найхутчэй. Калі чалавек дома, ён запісвае думкі, якія прыходзяць у галаву, а калі ён без доступу да паперы, думкі паўтараюцца, клубяцца і часта западаюць у памяць і толькі пасля вяртання дамоў пераліваюцца на паперу.

Прафесар Ян Чыквін заахвочваў моладзь пісаць вершы, апавяданні і дасылаць іх у аб'яднанне, а таксама пераконваў, што трэба трымаць сувязь з бацькаўшчынай. Каб падкрэсліць сваю лучнасць з Гайнаўшчынай, напомніў пра родную вёску Дубічы-Царкоўныя, з якой, будучы малым дзіцём, бачыў як бамбілі Гайнаўку.

— Месца, дзе чалавек нарадзіўся, з'яўляецца для яго выключным, святым. Некаторыя людзі далёка адыходзяць ад свайго месца дзяцінства, і тады адрываецца пупавіна, а чалавек без сокаў гіне. Калі мы жывём далёка ад сваёй роднай вёскі ці горада, у галаве трэба трымаць сувязь са сваёй роднай мясцовасцю і быць верным таму асяроддзю, у якім узрасталі, — тлумачыў моладзі прафесар Ян Чыквін. — Для чужых людзей мы ніколі не будзем сваімі, а заўсёды трэба быць сабою і цаніць свае родныя месцы — Грабавец ці Елянку, незалежна, ці пражываем пастаянна ў Варшаве ці Познані.

Гэтую тэму падхапіла бібліятэкарка Гайнаўскага белліцэя матушка Ірына Ігнатовіч.

— Калі мы з сям'ёй жылі непадалёк Шчэціна, бо мой муж служыў там святаром, адчувалі сябе там чужымі і з кожным годам было горш, покі не вярнуліся ў Гайнаўку. І толькі тут мы адчулі, што знаходзімся ў сябе дома, — тлумачыла матушка. — Я паўтараю белліцэістам, што яны не аценьваюць належным чынам таго, што маюць.

Прафесар Ян Чыквін звярнуў увагу на выдаваны „Белавежай” штогоднік „Тэрмапілы”. Да гэтай пары з друку выйшла 12 нумароў гэтага выдання (пад 300 старонак кожны).

— Я прыйшоў да высновы, каб стварыць літаратурны штогоднік, у якім маглі б друкавацца творы пісьменнікаў, што не могуць друкавацца ў Беларусі або творы тых літаратараў і крытыкаў, якія не хочуць выдаваць там сваёй творчасці. Такім чынам мы па меры магчымасцей дапамагаем беларускай мове і культуры, — тлумачыў старшыня Ян Чыквін.

— Мы рашылі, што найважнейшай легітымацыяй нашага аб'яднання будуць выдадзеныя нашымі пісьменнікамі кнігі, — гаварыў Ян Чыквін, звяртаючы ўвагу на бібліятэчку „Белавежы”, у якой з 1990 года з'явілася больш за 60 загалоўкаў кніжак.

У час сустрэчы ішла таксама гутарка пра наймалодшых членаў „Белавежы”, асабліва пра Юрку Буйнюка з Маліннікаў і Юстыну Каролька (народжаная Грыцюк) з Гайнаўкі. Старшыня Ян Чыквін заахвочваў гайнавян прыбыць на цэнтральныя святкаванні 50-годдзя Беларускага літаратурнага аб'яднання „Белавежа”, у якіх будзе вельмі ўрачысты характар. Прымуць у іх удзел даследчыкі літаратуры — айчынныя і замежныя (з Мінска, Масквы і Лондана). А гайнаўскія белліцэісты падрыхтавалі спектакль, прымеркаваны да юбілею. Дырэктар Беларускага музея Ян Карпюк таксама плануе наладзіць у музеі чарговую сустрэчу з „белавежцамі”.

## Заблудаўскія сабакі

Даволі часта прыходзіцца мне бываць у Заблудаве — і даехаць туды мне лепей, чым у сталіцу сваёй гміны Нарву, і вярнуцца дахаты. У 9[29] ад’язджае аўтобус з Заблудава праз маю вёску Бялкі ў Бельск-Падляшскі — і да сямейнага лекара ў Заблудаве многа бялчан прыпісалася, ды праз Заблудаў даедзеш і ў Беласток.

Калі б я не быў у Заблудаве, заўжды ў цэнтры горада бегае чарада бяздомных сабак, вылежваюцца яны часта і на аўтобусным прыпынку ПКС. Людзі іх абмінаюць, праходзячы. Спачываюць яны і перад крамамі, часта проста на ступеньках вядучых у краму. Тут жа ёсць і будынак гарадской установы, па абодвух яго баках — прадуктовыя крамы, на заходнім баку адна прыватная крама, і другая, „геэсаўская”, а на першым паверсе таго ж будынка — кааператыўны офіс (у гэтым будынку пры „камуне” была г.зв. мардабойня — „Гаспода ГС”). А ўсе прыступкі апанавала сабарня!

Я, быўшы 21 красавіка г.г. у Заблудаве, хацеў увайсці ў тую геэсаўскую краму купіць мароженую рыбу (быў гэта апошні тыдзень да Пасхі), ды там на ўсходках разлягліся вялікі кудлаты сабака, а побач яго чатыры меншыя і я проста пабаяўся зайсці! Пайшоў я насупраць магістрата, дзе стаялі знаёмыя мне заблудаўцы і спытаўся ў іх, чые гэта сабакі. „А чаму ты цікавішся заблудаўскімі сабакамі?” — спыталіся ў мяне. Я адказаў, што спалохаўся сабак, і напішу пра гэта ў „Ніву”. Папрасілі, каб я гэтага не рабіў, бо будуць злосныя бурмістр ды камендант заблудаўскай паліцыі! Выглядае на тое, што ўсе ведаюць, чые гэтыя сабакі. Ці паліцыя чакае, каб яны каго пакусалі? Тудою ж штодзённа ходзяць дзеці ў школу. На біду мала трэба! Мае размоўцы жартавалі, што ў Заблудаве працуе 18 паліцыянтаў, а калі псярня будзе большая чым 18 штук, дык паліцыі будзе чым займацца!

**Мікалай ЛУК’ЯНЮК**

## Даплаты да гектараў

Ужо пяты год сяляне падаюць заявы ў Сельскагаспадарчае агенцтва на даплаты да гектараў. Агенцтва прысылае ўласнікам зямлі гатовы фармуляр для запаўнення. А нялёгка правільна запоўніць гэтую адмысловую паперу! У Нараўцы на працягу двух месяцаў дапамагаюць у гэтым у некалькіх пунктах спецыяльна абучаныя маладыя дзяўчаты. Заязджаеш у вызначаныя гадзіны, пастаіш у чарзе і атрымаеш умела запоўнены фармуляр. Усё гэта робяць бясплатна. Жыхар Дашоў гаварыў, што ў Кляшчэлях за запаўненне фармуляра бяруць 30 злотых. Заяву трэба завезці ў павятовы аддзел Агенцтва мадэрнізацыі сельскай гаспадаркі.

Зімою на банкавыя рахункі ўласнікаў зямлі прыйдуць даплаты. Чым больш апрацоўваеш зямлі і сенажацяў, тым большыя даплаты атрымаеш. Так дзяржавы Еўрасаюза дапамагаюць сельскай гаспадарцы.

**Мікола ВАРАНЕЦКІ**

# Начная прагулка па музеях



Тэкст і фота Ілоны КАРПЮК

**Ноччу з 17 на 18 траўня ў большасці еўрапейскіх краін можна было глядзець выстаўкі ды ўдзельнічаць у спецыяльна падрыхтаваных мерапрыемствах з нагоды чарговай „Ночы музеяў”. Першая такая ноч адбылася ў Берліне ў 1997 годзе. Цяпер дзверы музеяў у гэтую ноч адкрываюцца ў больш чым 120 гарадах. Усюды, дзе ў музейнікаў адкрылася ўяўленне, можна было пайсці і павесяліць не толькі вочы, але і вушы.**

Наведвальнікаў у гэтую ноч чакала шмат атракцый. Сам Беласток прапанаваў сімпатыкам гісторыі і мастацтва цэлы музейны шлях. У Музеі войска чакала сустрэча са зброяй, Гістарычны музей знаёміў з татарскай культурай. У Музеі імя Альфонса Карнага чакалі тыбецкія матывы. Вельмі важна, што Беласток не забыў пра сваіх усходніх суседзяў, таму ў Падляшскім музеі можна было паглядзець „Археалагічную спадчыну Беласточчыны і Гродзеншчыны”, а ў Галерэі імя Сляндзінскіх — паштовыя карткі з І паловы XX стагоддзя са збораў Яна Лялевіца, а на іх — Гродна. Цікавай таксама аказалася экскурсія па цэнтры Беластока, у ходзе якой дырэктар Падляшскага музея Андрэй Ляхоўскі распавядаў у галоўным пра жыццё беластоцкіх яўрэяў у даваенны час. Аднак гэта не ўсё, бо ў большасці музеяў гучалі музыка, канцэрты, інструментальныя сольныя выступленні ці паказы слайдаў. Калі глянуць на колькасць музеяў і галерэй на Падляшшы, то напэўна не хапіла б ночы, каб усюды з’ездзіць. Але не па кожным музеі можна было шпацыраваць усю ноч, найчасцей да поўначы, як гэта было ў Беластоку. Пакуль я ў апошні момант паспела заглянуць у сцэны беластоцкай галерэі „Арсенал”, паехала даведацца што сваім гасцям падрыхтаваў Прыродазнаўча-лясны музей у Белавежы.

Белавежа здаўна вядомая ўсяму свету. Першабытная прырода, кароль пушчы — зубр, птушкі, звяры, натуральнасць. Усё гэта можна пабачыць у натуры, але і пайсці ў музей, дзе гід распавядзе пра самыя важныя элементы пушчанскай спадчыны. Прыродазнаўча-лясны музей, уключаючыся ў акцыю „Ноч музеяў”, хацеў паказаць сваю актыўнасць ды прывабнасць турыстам і жыхарам самой Белавежы. Кожнага, хто ў 19 гадзін заглянуў у музей, прывітала новая выстаўка. Захавальніца фондаў музея Ева Мароз-Кэчынская і яе муж Андрэй Кэчынскі падрыхтавалі падборку рэпрадукцый графікаў з XIX стагоддзя з выявамі Белавежскай пушчы. Ева Мароз-Кэчынская сказала, што выстаўка здзейснілася перш за ўсё дзякуючы сістэматычнай працы і запалу доктара Чэслава Аколава, які гадамі збіраў іканаграфію Белавежскай пушчы.

— Яна шмат часу ляжала проста ў бібліятэцы Белавежскага нацыянальнага парку, — сказала Ева Мароз-Кэчынская. — Пакуль я стала захавальнікам, працавала ў бібліятэцы і там пачала знаёміцца з сабранымі матэрыяламі.

А было з чым. Доктар Аколаў, былы дырэктар Белавежскага нацыянальнага парку, шукаў мастацкіх прац усюды — на аўкцыёнах, у інтэрнэце, у старых кніжках, купляў у бібліяфілаў. Гэта не толькі забірала яму многа часу, але патрабавала таксама грошай.

— Сёння, калі ў антыкварыятах ці на аўкцыёнах паяўляюцца такія мастацкія шэдэўры, з-за вялікіх коштаў не заўсёды можам іх купіць, — дадае спадарыня Мароз-Кэчынская. — Але з 2003 года ўдалося мне купіць яшчэ чатыры графікі, можна сказаць новыя, бо так, праўду кажучы, усё ўжо маем, — смяецца захавальніца.

Для выстаўкі падабраных было 40 прац. Перш за ўсё прадстаўляюць яны дасягненні ілюстратараў XIX стагоддзя, хаця можам знайсці рысункі з пачаткаў XX стагоддзя. Пачынальнікам увекавечвання Белавежскай пушчы сучаснымі тады спосабамі з’яўляецца Якуб Сакалоўскі, якога першая праца надрукаваная была ў 1826 годзе. Пра гэтае, як і пра шмат іншых цікавых рэчаў звязаных з літаграфіяй, тэхнікамі ілюстрацыі ці ўвогуле самой з’явай адлюстроўвання пушчы ў кніжках у той перыяд пазнаёміў гледачоў Андрэй Кэчынскі. Цяжка было паверыць, што чалавек можа распараджацца такімі шырокімі ведамі пра прыроду, гісторыю ды тэхніку адначасова ды яшчэ расказваць пра гэта з галавы ў вельмі цікавы спосаб, чаго доказам была ўвага самых маладшых, некалькігадовых удзельнікаў вернісажу.

Так як і ў большасці музеяў, так і ў Белавежы наведвальнікі маглі чакаць чагосьці больш чым толькі выстаўкі. Арганізатары вінам і салодкім пачастункам запрасілі ўсіх на канцэрт Тодара (Зміцера Вайцюшкевіча) і гурту „WZ Orkiestra”. Аказваецца, што яны ўжо вядомыя ў Белавежы. Тодар не першы раз ужо канцэртаваў тут, таксама часта яму здараецца прыязджаць сюды проста ў госці, бо, як сам кажа, іх першы прыезд пару гадоў таму „не быў каменем кінутым у пустое”.

— У Белавежу прыязджаем заўсёды з сентыментам ды радасцю, — сказаў лідэр гурту „WZ Orkiestra”, — але самыя важныя гэта людзі. Маю тут сапраўды блізкага сябра. Другая справа гэта зоркі. Я ў Белавежы пабачыў упершыню такія зоркі. Пабываў шмат дзе, але ніколі не звярнуў на іх увагі. Зараз, калі маю свой хутар на Нёмане, бачу, што і ў Беларусі прыгожыя зоркі. Справа ў тым, што Белавежская пушча адкрывае чалавека на простыя рэчы, часам банальныя, як спеў салаўя ці момант, калі ў лютым кормяць зуброў.

Такое ўспрыманне ці бліскасць прыроды, якую адчувае Тодар, належным чынам ацанілі арганізатары „Ночы музеяў” у Белавежы. А чаму пры гэтай нагодзе якраз беларуская культура?

— Гэта адзіны момант, каб падкрэсліць перш за ўсё тое, што мы тут не абы-хто, што проста жывём у гэтым месцы спакон вякоў, а нашым прадстаўніком можа быць той, хто спявае „Я нарадзіўся тут”, хаця прыехаў здалёку, — кажа Ева Мароз-Кэчынская.

Канцэртная зала была запоўнена да адказу. Прыйшлі як фанаты Тодаравай творчасці, так і выпадковыя турысты, якіх Зміцер Вайцюшкевіч частаваў значнай дозай гумару і іроніі, але перш за ўсё зачароўваў іх сваёй асобай. Публіка часам спявала з ім, адказвала, супольна смяялася. У гэтым бачна нешта больш чым харызма...

Пра „Ноч музеяў” у Беларусі, на жаль, зашмат не чуваць. Можа таму, што ўсё ж такі гэта еўрапейская выдумка, а Беларусь трымаецца ад гэтага на адлегласці. Гэта не абазначае аднак, што беларускія мастакі ўвасабляюць палітыку сваёй дзяржавы. Зміцер Вайцюшкевіч прыехаў адзначыць гэтую нагоду ў Белавежу.

— Шкада, што я не магу ў Беларусі выступіць у „Ноч музеяў”, — сказаў Зміцер, — але прыемна, што прымае мяне Белавежа, месца вельмі блізкае майму адчуванню свету.

Мне аднак шкада іншага, таго, што Зміцер не змог, для прыкладу, выступіць у Музеі ды асяродку беларускай культуры ў Гайнаўцы. Чаму? Бо ў „Ноч мезеяў” гэтая ўстанова была закрытая для наведвальнікаў. Затое аматары піва маглі паглядзець экспанаты савецкай спадчыны ў яшчэ дзейсным, мабыць, выпадкова адкрытым „Бары ў Валодзі”. Цікава, але для стратэгіі прамоцыі беларускай культуры ў Польшчы гэта напэўна не ў карысць.



*Да пяцідзесяцігоддзя аб'яднання*
**БЕЛАВЕЖА**

# Уладзімір Цілюлька: Толькі скнара і лянівы не выпісвае „Нівы”!

**Тэкст і фота Міры ЛУКШЫ**



— Мала цяпер вы з Скольшчыны даеце матэрыялаў! — Уладзімір Цілюлька, у святочным малінавым касцюме, у дзень перамогі ў Саколцы вітае нас пад царквой Аляксандра Неўскага. А і мы можам самі папракнуць гэтага цікавага чалавека, родам з Сухініч (1944 г. нараджэння), шматгадовага беларускага актыўнага дзеяча і ніўскага карэспандэнта, аўтара памятнага заклiку „Толькі скнара і лянівы не выпісвае «Нівы»”, што не шле нам сваіх допісаў, не інфармуе беларусаў пра сакольскія справы, што, мабыць, увогуле піша ў стол. Бо пісаць мусіць, як той, які ўмее словам мяняць рэчаіснасць — каб выкінуць набалелае, каб перамагчы словам благое, словам — а нават і смехам. Беларускім словам. Якое стала папулярным на ўсёй Беласточчыне.

— Я ж іграў ролю ў яго п'есе, будучы вучнем шостага класа, у сваёй вёсцы! — радасна здзіўляецца Уладзімір Місяюк, родам з Чыжоўшчыны. — Я столькі гадоў у Саколцы служу, а ніколі наш парафіянін гэтым і не пахваліўся! Вельмі папулярнай была сярод тэатральных гурткоў камедыя „Дзесяць гектараў”! Я іграў ролю Грышы, які пераапранаецца за міліцыянта, каб памагчы свайму прыяцелю ў сардэчнай справе. Мой „мундзір” быў як і ў п'есе — пазычаны, штукаваны ад міліцыянта ды пажарніка. А ведаеце, як мастацтва адбіваецца ў рэаліях? Вяртаўся я быў з рэпетыцыі ў сваю вёску. Па дарозе зняў пажарніцкую шапку. А ў нашай вёсцы вельмі шчыра дзейнічаў быў міліцыянт, грамадзянін Тэтэрка, заўзяты змагар з самагоншчыкамі. Убачылі сяляне маю невялічкую постаць у форме, што набліжалася, быццам крадучыся, да вёскі, схаваўшы для непазнакі шапку: „Тэтэрка ідзе!”. Моцна злаваліся на мяне: столькі з-за мяне першаку павылівалі!

Камедыю ў двух актах „Дзесяць гектараў” уздумалі разам Уладзімір Цілюлька з Яўгенам Блізнюком. П'еса была надрукавана ў 1961 годзе ў „Навукова-літаратурным зборніку ад 1961 года — Беларускім календары” пад рэдакцыяй Міхася Кураша, Віктара Шведа і Уладзіміра Юзвюка. У зборнічку з каляндарнай часткай большы націск пакладзены на навуковыя доследы па гісторыі Беларускай сялянска-работніцкай грамады, але ёсць там і матэрыялы фальклорных здабыткаў, паэзія Алеся Барскага ды проза Алеся Свіська. І вось гэтая п'еса, у якой выступае дзесяць дзеючых асоб, датычыць вясковага жыцця. Пятрук — малады вясковы хлопец, Грыша — яго сябра, Калода — селянін, Ганна — яго жонка, Вера — іх дачка, Іван Распора — сын багатага селяніна, цётка Веры, дзядзька Веры і двух суседзяў-сялян. Першая сцэна — у хаце Петрука. У пакоі каля сцяны стаіць драўляны стол накрыты абрусам. З левага боку стала стаіць лава, з правага — крэсла, на якім сядзіць Пятрук і вострыць сякеру. Ну, вось, калі ў першай сцэне зброя — яна, мабыць, канчаткова павінна быць прыменена на працягу дзеянняў. Ды ж гэта камедыя... Моцна пачынаецца: „Ноч цёмная, цёмная, як ніколі. У такую ноч толькі гарэлку гнаць і рабаваць...” А „закахаўся наш Петручок”. „Ішоў ад краўца і з Верай сустрэўся. Сама дрыжала як асіна. Не знаў, холадна ёй было, ці што? Вочы блішчэлі ад слёз. Гаварыла, а голас дрыжаў... З волі бацькоў яна выходзіць замуж за Распору”. „Затуманіўся свет Петруку, і не бачыў перад сабой простай дарогі...” Вось, бачыце — п'еса па найлепшых сусветных узорах: і страшна, і смешна, і такія жарсці! Да таго на роднай мове. Вядома, патрэбны былі п'есы для тутэйшых самадзейнікаў, каб маглі яны нейк выявіць і даць напрамак сваім прыродным энергіі і таленту. Пра тое, як бурліла культурнае і грамадскае жыццё на Беласточчыне, можам знайсці адбітак і на пажаўцелых, ужо, старонках нашага тыднёвіка-хронікі тутэйшага жыцця. А ёсць яшчэ ж людзі, якія памятаюць, у жылах якіх плыве тая ж кроў, і ёсць ахвота падзейнічаць... Ды штораз менш іх... Усе яны шчыравалі на беларускай ніве, ахвотна бралі голас у важных — а іншых не было — для іх справах, і браліся за пяро ці аловак, каб пасвойму выказацца на старонках свайго тыднёвіка. Уладзімір Цілюлька быў карэспандэнтам, актыўным беларускім дзеячам на Сакольшчыне, чытаў нават у мясцовым радыёвузле (у 1967 г. — 37) гутаркі на розныя тэмы па-беларуску. Актыўна дзейнічаў у грамадскім і аматарскім руху. Мы сустрэліся ў Саколцы на святкаваннях Дня перамогі — разам з нешматлікімі гасцямі і жыхарамі Саколкі пайшлі з бацюшкам пасвяціць новы крыж на могільніку байцоў Чырвонай Арміі, што загінулі, вызваляючы Сакольскую зямлю. Пабач спадара Уладзіміра — ягоны сябра з Сухініч Ёзік Тур (родам ён з Гаркавіч), які таксама не шкадаваў сябе ў маладых гадах для беларушчыны. Яны разам выступалі ў аматарскім вясковым тэатры — амаль усёй вёскай. Беларускі гурток у Сухінічах быў вельмі актыўны, налічваў 58 асоб.

— Мы нашай п'есы „Дзесяць гектараў” не ставілі, але ведаю, што была вельмі папулярнай на Гайнаўшчыне ды Бельшчыне. Мы ставілі, памятаю, „Боты”, „Мікітаў лапаць”, „Паўлінку”, — пералічвае Уладзімір і ягоныя вочы молада свецяцца на бадзёрым, злёгку паараным зморшчынамі загарэлым твары. — Я раз толькі выступіў, заступіў брата. А як спявалі людзі!

Уладзімір Цілюлька вучыўся быў у Беластоку на будаўніка, у будаўніча-дарожным тэхнікуме, а калі пайшоў да работы, дык завочна. Працаваў у кааператыве ПСС — кіраўніком па справах інвестыцый і рамонтаў. Калі жыў у інтэрнаце, разам з Генікам Блізнюком (сааўтарам камедыі) уцякалі на Варшаўскую, дзе бурліла беларускае жыццё, рыхтаваліся тэатральныя, музычныя і танцавальныя калектывы. П'еса якраз і напісалася хлопцамі спецыяльна. П'еса пра каханне, але і пра самагонку. З ахвотай ставілася аматарскімі гурткамі і смяшыла гледачоў. Аж разгарэлася дыскусія на старонках „Нівы”, якую пачала Вера Леўчук: а чаму ж на беларускай сцэне адно п'юць ды п'юць?! Ці няма іншых, канструктыўных тэм і сцэн у беларускім былым і сённяшнім жыцці?!

Уладзімір Цілюлька крыху таямніча ўсміхаецца. Ці мае што новага ў сваіх шуфлядах? Бо ж нават, бывала, крыху і больш лірычнае. А найбольш — з гумарам. Бо гэта ж „Толькі скнара і лянівы не выпісвае «Нівы»”!

— Цяпер нам вельмі прыкра, што ў „Ніве” так мала пра сакольскія справы. Усё ёсць — і Бельск, і Гайнаўка, і Беласток, і пра царкоўнае — а мы? Вы нас пакінулі на абочыне.

— Ну дык не маеце выйсця, адно — самому зноў узяцца за пяро!

Белавежа

## Што ўбачаць турысты?

Наведаў я Белавежу 9 мая г.г. Як вядома, зараз вясна ў разгары. Прыемна пабываць на прыродзе. Пайшоў па вуліцы Вашкевіча ад пачатку яе, ад касцёла, да канца — пры царкве. Гэта больш за 2 км. Тратуар тут ухабісты і яго не рамантуюць нават там, дзе ён найбольш зруйнаваны. Хаця б на тым ці іншым адрэзку. Ды дзе там!

Паабапал гэтай вуліцы сотні ліпаў. Ды 174 дрэвы гэта ўсяго ствалы без ніводнай галінкі, яны засохлыя ды мёртвыя. Так іх „падстрыглі” і „прасветлілі”? Варта дадаць, што гэта дарога павятовая.

Дашкі на аўтобусных прыпынках ПКС занядбаныя. Здаўна іх не аднаўляюць, не рамантуюць. Дашок каля касцёла з дзіркамі. Пад ім не схаваешся ад дажджу.

І яшчэ адно. Расклады язды аўтобусаў ПКС знішчаныя і невядома, калі яны ездзяць. У каго разведаць, да каго падацца?

Вось так у Белавежы перад турыстычным сезонам.

Крыніца

## Людзі і дзікі

У нядзелю, 11 мая г.г., наведаў я вёску Крыніца ў Нараўчанскай гміне. На месцы спытаўся, што найбольш хвалюе зараз жыхароў гэтага сяла на ўскраіне Белавежскай пушчы. Аказваецца, што дзікі не даюць спакою.

— Дзікі, — кажа Уладзімір Паскробка, 85-гадовы жыхар гэтай вёскі. — Яны нават аблог зрылі. Шукаюць мо нейкіх смакавітых карэньчыкаў або лічынак.

— Раней, бывала, дастаткова было б нітку працягнуць вакол палетка ад слупка да слупка і дзік за яе не прайшоў, — расказвае Вольга Федарук. — А цяпер брэху сабакі не баяцца. Пасадзім бульбу, дык яны нават на саджанцы палакоміцца. А што будзе калі збожжа (у нас пшаніца ды трыцікале) даспее або бульба вырасце? Проста страх падумаць. Трэба будзе ноччу ісці ў поле дзікоў адганяць! Зараз, калі ўвойдуць на загоны, усё знішчаць датла.

— Братко (гэта любімае слоўца майго суразмоўцы), ішоў я дарогай за вёскай. А тут статак дзікоў перабягае. Усіх з дваццаць штук было. Найперш старыя, вялікія, а за імі малыя ды рухлівыя, жвавыя, быццам чарцяняты. Так і шуснулі ў кусты! Прызнаюся, што крыху мяне напалохалі. Усё адбылося так неспадзявана.

Семяноўка

## Знявечаныя ліпы

Пры адной з вуліц у Семяноўцы (Нараўчанская гміна) знаходзіцца сама менш 60 стваловкоўных ліп. Жудасна зараз, у маі, калі ўсё зазеляняла навокал, глядзець на так знявечаныя дрэвы. На душы робіцца і сумна, і страшна. Гэта ўжо не дрэвы, а нейкая жахлівая рэзьба па дрэве!

Па-мойму, гэтыя ствалы з куксамі, якія знаходзяцца пад электраправадамі, неабходна ссячы. І краявід змяніўся б. А так быццам бы нейкі катаклізм спаймаў гэтую спакойную вёску.

Якое ж дрэва без верхавіны, без галін?

**(ян)**


Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

# Зорка

для дзяцей і моладзі


# Няма смачнейшай вадзіцы як з роднай крыніцы!

Сёння завітаем да сяброў у гайнаўскую „шасцёрку”, якія запрасілі нас на Свята беларускай культуры (адбылося яно 16 мая г.г., у пятніцу). І скажу адразу — я яшчэ ніколі не пабывала на такой імпрэзе! Ідзе пра адну файнасць: тут не было публікі і выступаючых, толькі гулялі і змагаліся ўсе: дзеці, настаўнікі, бацькі. Свята арганізавалі для дзяцей першых, другіх і трэціх класаў Пачатковай школы. Тое, што большасць з прысутных не вывучае беларускай мовы, не мела тут значэння. Ад радасці і смеху ў зале запанаваў гул як у „скварэчніку” (так калісьці гаварылі пра гул „жэмэрвы” — раданай дзіцячай кампаніі!). Праўда, многія дзеці да канца не разумелі што такое адбываецца. Проста ўсіх заваявала атмасфера.

Аднак па чарзе...

Хоць свята адрасавалася наймалодшым школьнікам, яго ранг быў на найвышэйшым узроўні. Апрача ўсіх настаўнікаў I-III класаў, працаўнікоў святліцы, настаўнікаў фізкультуры і трох спадарынь дырэктарак, з’явіліся важныя госці. Між іншым, метадыст Іаланта Грыгарук (з ружамі для настаўнікаў), дырэктар музея спадар Янка Карпюк, бацькоўскі камітэт у асобах спадара Міраслава Раманюка і пані Анны Навіцкай-Целушэцкай, кіраўнік бельскай „Жэмэрвы” Аня Фіёнік ды многа-многа бацькоў, а нават бабулі. Усё адбывалася ў гімнастычнай зале, густоўна аздобленай каляровымі капамі, вышыванымі ручнікамі, этнаграфічнымі прыладамі з рэгіянальнай залы. У цэнтры красаваўся вялікі лозунг: „Няма лепшай вадзіцы як з роднай крыніцы”.





І сапраўды, „з роднай крыніцы” былі ўсе спаборніцтвы. Бо асноўную частку склаў міжкласны турнір.

— А хто прыдумаў такія задачы? — пытаем галоўную каардынатарку свята Людмілу Грыгарук. Бо гульні былі дапасаваныя да ўзросту школьнікаў. Дзеці мелі за задачу пацэліць клубком у кошык, былі гонкі коней (якіх лейцамі паганялі фурманы), звіванне ручнікоў на прасніцу, называнне этнаграфічных экспанатаў са школьнага музея, укладанне пазлаў (беларуска ў народным касцюме). Цікава, што найбольш эмоцый выклікала спаборніцтва, у якім удзельнічалі дзеці і бацькі. Першыя мелі за задачу пасадзіць, другія сабраць з поля бульбу. Як відаць, гэтую працу гайнавяне маюць у крыві!

— Мы хацелі, каб спаборніцтвы былі ў нашым, беларускім духу, — кажа Люміла Грыгарук. І просіць напісаць, што дапамагалі ёй і спадарыні Бэаце Кендысь усе настаўнікі. А найбольш пані дырэктар Ірэна Кулачэўская, якая поўнасцю іх падтрымала...

Вядома, беларускае свята не магло адбыцца без музыкі і тэатра. Ужо на пачатку імпрэзы выступіў школьны гурт „Гіп-топ” (які працуе пад кірункам Евы Галашэвіч), ды вучні з класаў, у якіх вядзецца навучанне беларускай мовы. Дзеткі паказалі таксама лялечны спектакль „Каза Манюка”, у якім галоўную ролю „апавядальніка” іграла першакласніца Аня Несцярук, лаўрэатка конкурсу „Беларуская гавэнда”. А вучні з чацвёртага „а” класа запрэзентавалі танцы.

— Нашы танцы ў пэўнай ступені творчыя, — адзначае выхавацелька класа Іаланта Ставаж, — іх прыдумала Магда Раманюк, якая ходзіць на ўрокі танца ў Дом культуры.



Чацвёрты „а” клас адзіны на цэлую Гайнаўку. Тут усе вучні — 27 асоб — з першага класа вывучаюць беларускую мову (мова пра пачатковыя школы).

— І маю надзею, што так будзе да канца трэцяга класа гімназіі — кажа выхавацелька.

— У класе нават „Мікалайкі” святкуюць па-праваслаўнаму (19 снежня), — дадае Міраслаў Раманюк, бацька танцоркі Магды.

Арганізатары, мабыць, не спадзявaліся, што ўсе ўдзельнікі свята на канец пойдуць у танцы. Бо мерапрыемства завершыцца вялікім карагодам. Аня Фіёнік з ходу навучыла ўсіх гайнавян новай песенькі пра „Бусла і жабу” і паказала як калісь „жэмэрва” вадзіла карагоды. („Бусел, бусел, клекатун, узяў жабу за каўтун, жаба яго кулаком, а ён жабу дзюбаком!”)

— Вой як прыгожа! — захапляецца ўголас бабуля Люба Сац, якая прыйшла паглядзець на ўнучку Патрыцыю. Кажа, што ўнучцы падабаецца беларуская мова.

— Я таксама сёння моцна перажываю, — кажа Іаланта Грыгарук, наша пані метадыст. — Тут на практыцы паказаная беларуская душа. Нашы гульні, песні, гумар, прыказкі. І ўсяго тут па меры, усё дапасавана, добра сарганізавана.

— Які ўплыў на навучанне беларускай мовы маюць такія мерапрыемствы?

— Калі вучні гэтай школы прыходзяць у гайнаўскі белліцэй, адразу відаць з якой яны школы. Для іх беларуская мова, культура не чужыя, яны ведаюць нашы песні, прыказкі, ведаюць як павесці мерапрыемствы. Проста, калі з гэтай школы прыходзіць у белліцэй эліта, яна і ў нас з’яўляецца элітай.

Хоць свята было адрасаванае наймалодшым, у яго арганізацыю ўключыліся добраахвотнікі-гімназісты.

— Яны самі прыйшлі да мяне і папрасілі даць ім задачы, — каджа Людміла Грыгарук.

**ЗОРКА**

**Фота Ганны КАНДРАЦЮК**

# ГІСТОРЫЯ ПРА ЧЭРВЕНЬСКІ СОН

Ах, Волечка!.. Мілая Волечка, яна гэтак любіла... Хаця, мілыя мае, калі скажу зараз аб гэтым, — далей будзе не надта цікава. Таму толькі адзначу: тое, што гэтак любіла, ніколі не дарыў ёй Антончык. Ён прыносіў пакункі шыкоўных цукерак, ці бутэлечку „кока-колы", ці модны стракаты шалік — а вось каб хаця б аднаго разу..., хаця б... І Волечка — яна ж была ціплай таксама; і проста не магла ні сказаць яму, ні намякнуць.

Яна дзякавала за падарункі, усміхалася Антончыку ў адказ; і ўсё ж ледзь прыкметная журбота хавалася ў ейных вачах. А травень між тым буяў, белая квецень абвіхуравала дрэвы, клумбы на вуліцах узрываліся самымі дзівоснымі фарбамі.

— Ведаеш, — неяк дзіўным, прыцішаным вечарам ускінула свае вочы Волечка на Антончыка. — Вось мы зараз разыдземся, але перад тым, як легчы спаць, я загадаю адно жаданне.

— Якое? — спытаўся юнак.

Волечка па-ранейшаму неадрыўна глядзела ў ягоныя вочы.

— Калі ты прыходзіш не проста так..., — нарэшце прамовіла. — Калі ты насамрэч з усёй сваёй цеплынёй..., ты здагадаешся.

І нічога болей не сказала. Толькі ціха пацалавала яго ў краёчкі вуснаў.

Яна пайшла, не азіраючыся. А хлопец крыху ўскінуў брыво, задумаўшыся...

Веснавая ноч мінае хутка. Мінула і гэтая, таямнічна-даўкая, зорнавільготная, незвычайная. А на раніцу, калі Вольга прачнулася, калі салодка пацягнулася і працягнула руку пад падушку... Яна адначасна і рэзка яе адхапіла, і шчасліва заўсміхалася. Адхапіла таму, што ўкалола свае пальцы. А засмяялася — што, калі адкінула падушку, там ляжала надзіва прыгожая, пахноткая, дзівосная ружа. І зусім не было прымятае ейнае лісце. А моцны бутончык, здавалася, толькі-толькі быў акроплены расістымі кроплямі вільгаці.

І гэткая ж шчаслівая кропля вільгаці раптам з'явілася на краёчку дзявочых вачэй. І Волечка ціха-ціха прамовіла:

— Дзякуй табе, Антончык.

У тую ж самую хвілю прачнуўся ў сваім пакоі юнак. Прачнуўся, адразу адчуўшы, адразу зразумеўшы... Тым няўлоўным была ціхая думка, што ў сваім сне ён беспамылкова ўгадаў запаветна-затоенае жаданне дзяўчыны. І яму стала радасна і сорамна адначасна...

**Ваш Дзядзечка Сід**

5 траўня 2008 г., Кобрын



Фота Ганны Кандрацюк

*Матушка Ганна і айцец Аляксей Пятроўскія з дачушкай Калісай (Ганна, з дому Садоўская, шматгадовая карэспандэнтка „Зоркі")*

# Музыка з кайфам

## „Drum Ecstasy" — шоу з бубнамі

Як гурту перартрываць пятнаццаць гадоў, калі няма ў ім вакаліста? Гэтае пытанне трэба задаць Філу Чмыру, лідэру „Drum Ecstasy". Гэта напэўна нялёгкая справа, бо якраз вакалісту найлягчэй наладзіць кантакт з публікай. У выпадку гэтага гурту, на маю думку, дзейнічае нейкі гіпноз...




„Drum Ecstasy" заснаваны ў 1993 годзе. Не ведаю як было ў пачатках, але зараз відавочна, што яны патрэбны не толькі слухачам, але і ў вялікай ступені гледачам. Каб звярнуць на сябе ўвагу, музыкам трэба было паказаць не толькі якасць творчасці, але і знайсці сваю мастацкую нішу. Аказваецца, што пару бубначоў і бас-гітара гэта ідэальны выхад для ўпрыгожвання розных мерапрыемстваў. Гучыць гэта крыху смешна: „упрыгожванне дзякуючы жорсткай музыцы бубнаў", але па сутнасці для вялікіх прадпрыемстваў, якія адкрываюць новыя салоны, вялікія гандлёвыя цэнтры, такое шоу гэта неспадзяванка ды якасць сама па сабе. Сведчаць аб гэтым хаця б умовы прыёму патэнцыяльных музыкаў у гурт. Чакаецца ад іх не толькі пачуццё гумару ці альтэрнатыўнасць думання, але перш за ўсё лёгкасць валодання інструментам і музычная адукацыя, бо неаднакратна прыходзіцца ім граць на бубнах па нотах.

Гурт выступаў па ўсёй Еўропе. „Drum Ecstasy" можна было сустрэць на фестывалях ад Барселоны па Маскву ці Ніжні Ноўгарад. Не адзін раз былі яны гасцямі байк-шоу або ўдзельнічалі ў акцыях такіх марак як „Orbit", „Volkswagen", „Mazda", „Castrol", „Revlon" ці „Microsoft". Варта дадаць, што і публіка „Басовішча" магла глядзець „Drum Ecstasy" ў 2006 годзе. Гурт з'яўляецца аўтарам музычнай стужкі да фільма „Начная страж", але сапраўды цудоўным можна лічыць іхні перформенс „Oh! Empire" — дзеваць хвілін з музыкай, сцягам ды святлом. Мабыць і часткова з-за гэтага на нейкі час гурт забаранілі ў Беларусі. Ён знаходзіўся на гэтак званым „чорным спіску", побач такіх гуртоў як „Н.Р.М." ці „Нейра Дзюбель". Самае цікавае, што пасля такіх адносін улад сёння гурт, для прыкладу, адкрывае або закрывае такія спартовыя мерапрыемствы, як чэмпіянат краіны па футболе. Мабыць, Беларусь ідзе ў напрамку нармальнасці!

**i_basovka@o2.pl**

# Вершы Віктара Шведа

## Школьны рэжым

— Ёсць, адазваўся Лявон,
Такі ў мяне час невясёлы,
У тыдні некалькі дзён,
Што не хочацца мне ісці ў школу.

А якія ж дні гэта, скажы,
Што табе зусім нязручны?
Гэта школьны нязносны рэжым
З панядзелка па пятніцу ўключна.

## Выпадаюць самыя

Цырульнік хлапца падстрыгае
І бачыць стан невясёлы.
— Табе валасы выпадаюць,
Патрэбны тут дэрматолаг.

Да лекара ходзіш часамі?
Валос ужо выпала многа.
— Яны выпадаюць мне самі,
Без лекараў дапамогі.

# Польска-беларуская крыжаванка № 22




Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы, з наклеенным кантрольным талонам, на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

**Адказ на крыжаванку № 18:**

Самка, мір, дом, сода, вазон, валасы, Ярыла, яр, ачос, збан, на, асоба. Гід, вярба, ровар, Ас, малы, зала, сосачка, кроны, ясны, матор.

Узнагароды, запісныя кніжкі, выйгралі: **Магда Кіндзюк, Магда Сакалоўская** з Дубін, **Юліта Нікалаюк, Данеля Філіманюк, Кася Нястэрук** з Чыжоў, **Паўліна Юрчук, Мірон Марчук** з Белгімназіі ў Гайнаўцы, **Юстына Шчэнсновіч, Каміля Чэрэмха** з Бабік. Віншуем!

# Бог мяне ахоўваў

*Успаміны Іосіфа ГРЫЦА са Старой Луплянкі, народжанага ў 1914 годзе.*



Фота Аляксандра ВЯРБІЦКАГА

**У 1915 годзе наша сям'я адправілася ў бежанства. Таты тады ўжо з намі не было, пайшоў ён на вайну і не вярнуўся. А нас было трое дзяцей: брат быў з 1910 года, сястра з 1912 і я — наймалодшы. Выехалі коннай падводай, але, бадай у Мінску, прадалі коней і далей ехалі поездам. Апрача нас, дзяцей, ехалі ў нашай сям'і мама, дзед і баба па бацьку ды дзве татавы сястры. У дарозе ў напрамку Сібіры памёр дзед.**

Заехалі ў Краснаярск, там пасялілі нас у асобнай драўлянай хаце — запасной хаце гаспадара. Жылі мы недалёка станцыі, дзе паязды ездзілі. Пакуль быў цар, то давалі падмогу, а калі насталі бальшавікі, тады аднялі падмогу і жыві як хочаш. І я стаў жабраваць, хадзіў на базар і прасіў у вясковых людзей то булачку, то калачы. Падыходзіў і гаварыў:

— Падарыце, радзі Хрыста, штонібудзь.

І дзіцяці людзі давалі. Абуваліся мы ў башмачкі, бо не было нічога іншага. Не было чым прыварыць есці і хадзілі мы на станцыю каб палена якое здабыць. А як ужо дайшло да таго, што нічога немагчыма было атрымаць, тады мама аддала нас у прытулак. У прытулку было многа людзей. Мы, дзеці, былі ў прадшколлі раней, вучыцелька намі апекавалася. У дзень давалі там стакан чаю і кусочак самога хлеба, а нанач вярталіся дахаты. А ў нядзелю давалі толькі белую булачку і больш нічога. Тады на Паволжы быў ужо голад і адтуль у Краснаярск наехала шмат татараў. Такі чалавек сядаў між рэек, падаў і — гатоў.

У 1922 годзе мы выехалі адтуль у маі, пагрузіліся ў таварныя вагоны. Далі нам тады запамогу і на некаторых станцыях давалі есці. Едзем каля высокай гары, а людзі гаварылі, што гэта Уральскія горы. Прыехалі да Волгі, пераехалі мостам у тры кіламетры даўжыні. Праваднікі крычалі каб закрываць вокны і не выглядаць. Пераехалі Волгу і поезд спыніўся. А мне ад таго ў памяці асталіся параходы і маторныя лодкі. Стаялі так доўгі час, а як прыехалі пад Маскву то таксама сталі адзінаццаць сутак; у той час брат забіраў мяне на станцыю і трамваем ездзілі.

З Масквы прыехалі ў Баранавічы. Выгрузіліся ў барак і там давалі нам есці. Гаварылі, што ў нашым эшалоне было сорак восем вагонаў, многія людзі з іх дамагаліся запамогі і тую запамогу ім давалі. Іншым было цяжэй.

У Баранавічах пагрузіліся мы ў польскія вагоны, у якіх мы прыехалі ў Свіслач. А тут ідзі і шукай свайго месца. Мама пабачыла, што тут усё было спалена. І запамогі ніякай не было.

Пайшлі дзеці служыць. Сястра пайшла да жыда ў Ялоўку дзяцей няньчыць. Брат падаўся ў Тарнопаль пасвіць дабытак у аднаго чалавека, а той яму за гэта нічога не даў, толькі карміў.

Так мучыліся без хаты. Жылі спачатку, да зімы, у сваяка. Зімавалі ў мамінага дваюраднага брата ў Лявоневічах. А пасля жылі ў дзядзькавай хаце ў Луплянцы. Тры зімы так жылі па чужых хатах. А я хадзіў па полі і жабраваў, прасіў каб бульбачку якую далі. Гаспадарка ў нас была і на трэці сноп нам яе абраблялі. І мая мама жабравала. У 1925 годзе аддала яна мяне ў фальваракі ў Ашыўкі, што цяпер за граніцай, у Беларусі. Пасвіў я там кароў, зарабляючы па дваццаць пудоў жыта за лета.

Пры цары ў Ашыўках быў пан, а яго сын працаваў у Варшаве ў міністэрстве. Той пан меў грошы і золата, якія схаваў у печ у падвале. Уначы прыехалі нейкія, павязалі пана і ягоных слуг і тое багацце забралі. Тады пан прадаў свой фальварак разам з жывёлай — дваццаццю коньмі — тром панам з Ваўкавыска. Яны дзеля таго ўзялі пазыку золатам у Свіслачы. Але пан дажываў на месцы, у Ашыўках.

Пасля я, з 1927 года, пасвіў авечак на Новай Луплянцы. Тады, навесну, памерла мама, было ёй 44 гады і мы асталіся самі. Я яшчэ ў 1928 годзе пасвіў у таго самага гаспадара, а два наступныя гады ў іншага. Пасля, у 1933 годзе памёр мой брат, а годам пазней і сястра — на сухоты. І я ў свае дваццаць гадоў астаўся сам.

Ажаніўся я, шэсць гадоў з жонкай пражыў. Яна хавала пляменніцу ў Мастаўлянах, заразілася тады менінгітам і ў 1940 годзе памерла. Сын быў спалохаўся, стаў хварэць. Памагала мне тады цешча. А саветы ўскладалі нормы — больш за тону збожжа трэба было здаць у Свіслач. А калі не, то ссылкай у Сібір пагражалі.

19 мая 1941 года атрымаў я павестку ў армію. Пайду я, думаю, у свіслацкі райвыканкам і там усё растлумачу, што ў мяне малое дзіця. Але ў справу даклаўся дваюрадны брат, яры камуніст. Ён зайшоў туды перада мною і нагаварыў на мяне. Я зайшоў да начальніка, а ён адразу:

— Ты за Польшчы не служыў?

— Не.

— І цяпер не хочаш?

— А як я маю дзіця пакінуць?

— Ступай і ўхадзі!

Вярнуўся я дахаты і пасля трох дзён зноў у Свіслач на станцыю. Сын астаўся з цешчай. А мяне пасадзілі ў поезд і ў Ломжу завезлі. З Ломжы пехатою загналі ў Кажаністэ пад Кольнам, там маёнтак быў. У будынках была сталоўка, а салдаты жылі ў палатках. Усе салдаты былі з нашых старон: ад Свіслачы, Цісоўкі, Семяноўкі.

Я трапіў у кулямётны ўзвод. Ва ўзводзе было нас 36 чалавек, лейтэнант, двух малодшых камандзіраў і сяржант. Абучалі нас абыходу з кулямётам „Максім" і аўтаматам. Страляць не стралялі, толькі была да гэтага падгатоўка. Да мяне чапляліся, што я крыжык насіў. Але Бог мяне ахоўваў і ў жывых захаваў.

Узялі нас быццам на сорак дзён, а пасля гэтага мелі адпусціць. Але дванаццаць салдат з узвода вызначылі на экзамен і я трапіў у іх лік. Таго экзамена, аднак, не ўспелі правесці.

Быў наш узвод на варце. Прыехаў лейтэнант вярхом і яго прапусцілі. То ён вельмі расхадзіўся і паведаміў, што наступнага дня будзе вывазка сарака сем'яў з Кольна. А ўначы ўжо немец бубніць і па Кольне б'е. І каб не вайна тады, то многа тамашніх людзей вывезлі б, а на іх месца пасялілі б чужых.

Аб'явілі пад'ём: „К оружию!" А ад мяне на той час нават вінтоўку забралі. Ідзём у напрамку Кольна, а насустрач нам пагранічнікі. „Куды вас гоняць? — пытаюць. — Мы мусім уцякаць і вы ўцякайце." Падагналі нас пад Кольна, а там немец з кулямётамі. Шчасце, што жыта там расло, было куды схавацца. І хто ўпаў, той астаўся. Пасядзелі так да падвячорка, а пасля сталі разглядацца. Адзін чалавек настроіў нам ісці на калонію і там перачакаць. Пайшлі мы ўчатырох, прасядзелі там тры дні.

А пасля сталі ісці, ад Кольна ў бок Беластока. Людзі да нас добра адносіліся, начавалі нас у хатах, кармілі, вопратку крыху падменьвалі, Дайшлі так да Беластока, выйшлі з Беластока на каляю, а тут немец...

Быў я ў загарадзе, у палоне, 10 дзён. Быў адзін чалавек, які прыходзіў гутарыць з намі. І ён штодня выводзіў па дзесятку чалавек на дарогу. Гаварыў:

— Ідзіце дамой, штоб вам Гасподзь даў шчаслівы пуць.

І казаў нам, што выпусцяць нас, але не ўсіх. Ну і загадалі нам выстраіцца па чатырох, а немцы хадзілі і выбіралі старэйшых і адпускалі іх дахаты. А апошніх у шопу заганялі. Уцякаць страшна, бо забіць могуць. І гаварыў я, каб мо ноччу ўцякаць, то можа ўдасца...

Прыйшоў немец і нешта гаворыць. А з намі жыдок быў і ён сказаў нам каб тыя ад Беластока выстраіліся, то іх пусцяць дахаты.

Стала сумятня. Я з сябрам за рукі ўхапіліся. Адабралі першых дзесяць чалавек і выпусцілі іх. А мы дваіх у другую чаргу выбіліся, наперад. Мы ўжо былі крыху пераадзетыя, я, напрыклад, шапку цывільную меў. А адзін чалавек ад Белавежы адзеўся ва ўсё новае, каб хаця дахаты. Але яго назад вярнулі, ён стаў плакаць. Зараз іншы сказаў: „Гэта мой сусед, ён тутэйшы." Немец тады загадаў паскідаць усё. Астаўся я ў адной кашулі. І ўдалося.

Ідзем у бок Гарадка па чыгунцы. За Гарадком выйшлі мы на дарогу і бачым, што двух такіх як мы немцы вядуць. Але нам удалося да Зуброў дабрацца і да Новай Луплянкі. Узіраюся, а ў нас немец стаіць і быццам чакае мяне. І думаю я: „Вяртацца ці хавацца?" Прысеў я быццам за патрэбай, пасля хутка схапіўся і стаў хутка ісці. Той немец пайшоў, а я вярнуўся дахаты. І ўжо больш ніхто да мяне не чапляўся.

Са збораў не ўсе вярнуліся, напрыклад Мінчук трапіў у Візну і не вярнуўся. А тыя, што ў маім узводзе былі, усе вярнуліся.

* * *

Хадзіў я ў Грыбоўшчыну, там Ілья быў. Пайшоў я ў 1935 годзе разам з іншымі. І пасля хадзіў, яшчэ пры саветах. І саветы, калі насталі ў 1939 годзе, чапляліся да мяне за гэта. Але я пазнаў, што Ілья не быў простым чалавекам. Людзі стаялі, а ён гаварыў ім:

— Я — Ілья, я прыйшоў угатовіць пуць Хрысту. Хрыстос явіцца і ўсе васплачуць.

Хадзілі мы пяшком, і коньмі ездзілі, і ўадзіночку хадзілі. Выходзілі рана, заходзілі на службу, часам начавалі. Пасля службы Ілья гаварыў пропаведзь.

Духавенства не прызнавала Ілью. Але ён меў медаль ад Пілсудскага і ад ваяводы крыж і яго цяжка было турнуць.

Да 1931 года ніхто яшчэ да Ільі не хадзіў ад нас. Пасля тыя што хадзілі сабраліся ў Канюках яшчэ перад Вялікаднем, яшчэ снег тады ляжаў. Яны маліліся, а на іх напалі, білі, выцягалі на двор. І ў той час свет стаў жоўты, і снег стаў жоўты перад захадам сонца. І мяне гэта здзівіла, што гэта была чыстая праўда. Калі я стаў хадзіць, то мне тады гэта расказалі тыя, якіх тады былі білі.

У Грыбоўшчыне маліліся ў хаце, там прастол быў. У 1938 годзе закладалі там другую царкву. Ілья тады сказаў:

— Закласці то мы заклалі, але не пабудуем, бо мы бедныя. Але настане час, што прыйдуць людзі з заграніцы і пабудуюць храм.

У 1940 годзе сніцца мне сон. Іду я па-за сялом дарогай, даходжу да Новай Луплянкі, да помніка, і голас чую:

— Ты ідзеш на гару, а гара гэта гора.

Я ўзышоў на гару і стала лягчэй. І дайшоў я да прастола Гасподняга, а Ён сам там сядзіць. Я крыкнуў „Ой!" і прачнуўся.

Другі сон таксама ў 1940 годзе прысніўся. Быў я адзін у хаце. Лёг на ляжайку спаць. Адышло ўсё чуццё, безуладны стаў. У хаце з'явілася святло. Двух анёлаў у мужчынскім відзе падышлі да мяне, падвялі пад акно ад поўдня. І пачуў я голас:

— Знай, тады ўсё будзе, як будзе ісці адтуль.

А адтуль хмара страшная з грымотамі паказалася, ударыў гром. Яны адвялі мяне, палажылі, і я апомніўся. І падумаў, што будзе страшная вайна ад поўдня...

Там, на поўдні, цяпер Іран, Ірак, Ізраіль...

Два пракокі былі, Іван і Ілья. Дзесяць гадоў таму прысніўся мне Іван Кранштацкі. Іду я, бачу — Іван Кранштацкі стаіць. Я пацалаваў яго руку і ён усклаў сваю руку мне на галаву і сказаў:

— Якою дарогай ідзеш, такою ідзі далей. Гасподзь табе паможа.

**Запісаў Аляксандр ВЯРБІЦКІ**

*Палацавы парк у Белавежы вядомы ўсім турыстам перш-наперш сваёй разнароднасцю расліннасці і прыгожымі краявідамі. Але шматлікія наведвальнікі звяртаюць увагу таксама на даўнія будынкі, якія спадарожнічалі галоўнай тут будоўлі — царскаму палацу, на жаль, ужо неіснуючаму (спалілі яго ў ліпені 1944 года, а руіны разабралі ў 1961-1962 гг.)...*

# Дом з багатай гісторыяй

**Пётр БАЙКО**

Палацавы парк у Белавежы вядомы ўсім турыстам перш-наперш сваёй разнароднасцю расліннасці і прыгожымі краявідамі. Але шматлікія наведвальнікі звяртаюць увагу таксама на даўнія будынкі, якія спадарожнічалі галоўнай тут будоўлі — царскаму палацу, на жаль, ужо неіснуючаму (спалілі яго ў ліпені 1944 года, а руіны разабралі ў 1961-1962 гг.). Адным з такіх будынкаў-спадарожнікаў з'яўляецца Маршальскі дом, які знаходзіцца ў сярэдне-заходняй частцы парку. Праўда, ён крыху па-за галоўнымі турыстычнымі маршрутамі, але той турыст, які захоча прайсціся нестандартнымі шляхамі, напэўна хутка яго прыкмеціць. Будынак прыцягвае зрок між іншым сваімі цікавымі карнізамі, прамавугольнымі мелінамі з цэглаў, складзеных наўскасяк тарчма, ці мансардамі, накрытымі двухпакатымі прыстрэшкамі з дэкаратыўна перакрыжаванымі бэлькамі ў вільчаках. Пастаўлены ён на цокале з чэсаных гранітных камянёў. Мураваны, з чырвонай цэглы. Паколькі быў ён збудаваны на нахіленым месцы, у заходняй частцы будынак трохпавярховы, а ва ўсходняй — двухпавярховы. Апрача таго ў гарызантальнай праекцыі мае форму лацінскай літары „L".

Маршальскі дом (першапачаткова называны Гофмаршальскім домам) збудаваны быў крыху пазней, чым апошнія будынкі на гэтай тэрыторыі, бо толькі ў 1904 г. — разам з Егерскім домам, у якім зараз змяшчаюцца м.інш. пошта і дзіцячы дом. Абодва будынкі запраектаваў Язэп Іванавіч Насалевіч (1871-пасля 1917-га), тагачасны архітэктар Галоўнага праўлення ўдзелаў.

Маршальскі дом быў прызначаны для вышэйшай прыдворнай службы. Часам затрымоўваліся ў ім таксама асобы, якія прыязджалі ў Белавежу ў турыстычных, навуковых або службовых мэтах. Падчас I сусветнай вайны змяшчаўся ў ім салдацкі клуб, а ў частцы памяшканняў жылі афіцэры-інжынеры з вайсковага праўлення Белавежскай пушчы. Пасля заканчэння ваенных дзеянняў у Маршальскім доме на некалькі гадоў пасяліўся прытулак для дзяцей — ваенных і рэпатрыяцыйных сірот, які падначальваўся Павятоваму камунальнаму саюзу ў Бельску-Падляшскім. Напрыканцы 1924 года ў прытулку, утрымоўваным за кошт дабрачыннасці, знаходзілася каля 40 дзетак.

У 1922 годзе, па ініцыятыве Міністэрства веравызнанняў і публічнай асветы, у Белавежы была адкрыта Дзяржаўная школа дрэваапрацоўчай прамысловасці. Была гэта школа рамесна-прамысловага тыпу па спецыяльнасці сталяр-будаўнік. Заняткі ў ёй адбываліся ў будынку пачатковай школы, якая знаходзілася па-за Палацавым паркам, а школьная майстэрня змяшчалася ў сутарэнні Маршальскага дома (потым была яна перанесена ў гараж). У першым годзе ў гэтай школе вучылася 14 хлапцоў з Белавежы, Тэрэміскаў і Пагарэльцаў. Кіраваў школай інжынер-мостабудаўнік Лявон Абрамовіч. У 1924 годзе школа была пераведзена ў Гайнаўку.




Восенню 1930 года ў Маршальскім доме размясцілася Біялагічная лабараторыя, якая мела працаваць у карысць ветэрынарна-жывёлагадоўчай апекі і даследчай працы над зубрамі. Яе арганізатарам быў д-р Конрад Врублеўскі. У 1933 годзе круг дзейнасці лабараторыі пашыраецца на ахову паляўнічай дзічыны — пераўтварылася яна ў Бактэрыялагічна-паляўнічую апазнавальную лабараторыю Інстытута даследавання дзяржаўных лясоў. Пасля вайны гэтая ўстанова дзейнічала як Апазнавальная станцыя хвароб паляўнічай дзічыны і была падначалена Філіялу Даследчага інстытута лясніцтва ў Белавежы. Ліквідавалі яе з канцом 1951 года.

У міжваенны перыяд у Маршальскім доме змяшчаліся таксама службовыя кватэры працаўнікоў Дырэкцыі дзяржаўных лясоў у Белавежы. Жылі тут м.інш. сем'і Гундлахаў (галава сям'і, Ежы, праславіўся як прэпаратар лясной дзічыны для мясцовага музея), Пангоўскіх і Шнайдэраў. Жыхарам дома быў таксама Станіслаў Лунеўскі, вядомы перш-наперш як аўтар прыгожых здымкаў прыроды Белавежскай пушчы, розных мясцовых аб'ектаў і сцэн з прагляду ўпаляванай дзічыны на прадстаўнічых паляваннях,ладжаных прэзідэнтам РП. Шмат гэтых здымкаў распаўсюджвалася на паштоўках.

Падчас нямецкай акупацыі лабараторыя была зачынена, а ў Маршальскім доме размясцілася Forschutzkommando.

У сакавіку 1945 года ў Белавежы адкрыўся Філіял Даследчага інстытута лясніцтва. Узнік ён на базе дзейнічаючага з восені 1944 года навукова-даследчага асяродка. Кіраўніком гэтай установы стаў Ян Ежы Карпінскі, тагачасны дырэктар Нацыянальнага парку. Філіял на шмат гадоў звязаўся з Маршальскім домам. Падлягалі яму м.інш. біялагічная і бактэрыялагічна-паляўнічая лабараторыі. У 1950 годзе на месцы філіяла ўзнікла Установа даследавання першабытных лясоў Даследчага інстытута лясніцтва (ДІЛ), перайменаваная потым на Лабараторыю даследавання першабытных лясоў ДІЛ, а далей на Установу аховы прыроды ДІЛ. Сёння гэты навуковы цэнтр называецца Установай натуральных лясоў ДІЛ. Маршальскі дом пакінула яна ў 1990 годзе, перасяліўшыся ў будынак на тэрыторыі Дырэкцыйнага парку, у якім калісьці змяшчалася царскае Праўленне Белавежскай пушчы.

У 1948 годзе ў двух-трох пакоях Маршальскага дома ўладкаваўся праф. Аўгуст Дэнель з групай сваіх асістэнтаў з Універсітэта Мар'і Кюры-Складоўскай у Любліне — Ірэнай Кубік (Базан), Станіславам Бароўскім, Ежы Кубікам, Здзіславам Пуцкам, Станіславам Сурдацкім, Вацлавам Васілеўскім і іншымі, якія ў пагадненні з Я. Е. Карпінскім приступілі да апрацоўкі багатай калекцыі млекакормячых. У 1952 годзе праф. Дэнель стварыў у Белавежы станцыю сваей люблінскай Кафедры параўнальнай анатоміі УМКС, якая праз два гады пераўтварылася ва Установу даследавання млекакормячых Польскай акадэміі навук. Установа займала частку памяшканняў Маршальскага дома да чэрвеня 1962 года, да часу ўзвядзення свайго будынка. Памяшканні ў сутарэнні яшчэ доўгі час займалі навуковыя калекцыі УДМ ПАН.

Вызваленнем часткі памяшканняў Маршальскага дома ў 1962 годзе пакарысталася дырэкцыя Белавежскага нацыянальнага парку, уладкоўвючы ў іх сваё бюро. Яно заставалася тут да вясны 2002 г.

У 1952 годзе, стараннем праф. Уладыслава Матушкевіча, у Маршальскім доме размясцілася таксама цяперашняя Белавежская геабатанічная станцыя (БГС), якая спярша падначальвалася Інстытуту батанікі ПАН у Кракаве, а з 1962 года — Варшаўскаму універсітэту. Першымі пастаяннымі працаўнікамі станцыі былі Мечыслаў Я. Дамброўскі, Аляксандр В. Сакалоўскі, Януш Б. Фалінскі (у 1962-2004 гадах кіраўнік станцыі). Пасля заканчэння будовы ўласнага комплекса будынкаў у жніўні 1974 года, БГС выйшла з Маршальскага дома.

Навуковую традыцыю дома працягвае створаная 1 верасня 1988 г. Навукова-даследчая лабараторыя Белавежскага нацыянальнага парку. Першым кіраўніком лабараторыі быў д-р інж. Чэслаў Аколаў, пазнейшы дырэктар БНП. 1 студзеня 2004 г. навуковую лабараторыю ўзначаліла д-р Рэната Кшысцяк-Касінская.

На працягу 15 гадоў у Маршальскім доме знаходзілася Выдавецкае аддзяленне Белавежскага нацыянальнага парку, створанае ў сакавіку 1990 г. У пачатку 2005 г. пераехала яно ў новы будынак, у якім змяшчаецца таксама адміністрацыя БНП. Да 1995 г. аддзяленне карысталася ўласнай паліграфіяй, якая была ліквідавана па прычыне ашчаднасці. З выдавецкім аддзяленнем звязана была рэдакцыя выдаванага з 1980 г. навуковага часопіса „Parki Narodowe i Rezerwaty Przyrody", якая пакінула Маршальскі дом у палове 2005 г. Варта яшчэ ўспомніць, што ў 1991 г. выдавецкае аддзяленне пачало выдаваць штоквартальнік „Parki Narodowe". Пасля выхаду двух нумароў рэдакцыю часопіса пераняло Краёвае праўленне нацыянальных паркаў.

У 1991 г. у Маршальскі дом пераведзена была навуковая бібліятэка БНП. Да гэтай пары змяшчалася яна ў палацавай браме, у якой „пасяліўся" ў 1983 г., пакінуўшы падвал Прыродазнаўчага музея БНП.

Безумоўная чароўнасць Маршальскага дома прычынілася да таго, што ў сакавіку 1975 г. Яцэк Карцэлі пастанавіў зняць на брукаваным пад'ездзе перад будынкам некаторыя сцэны для мастацкага тэлевізійнага фільма „Дамы з дажджу" („Domy z deszczu") у рэжысуры Рышарда Бера. У галоўных ролях фільма выступілі Ларыса Кадочнікава і Уладыслаў Кавальскі.

Рашэннем Ваяводскага захавальніка помнікаў старадаўнасці ў Беластоку ад 20 кастрычніка 1981 г. Маршальскі дом занесены ў спіс помнікаў старадаўнасці Беластоцкага (зараз Падляшскага) ваяводства.

У лістападзе 2000 г. усе чатыры ўваходы ў будынак атрымалі стыльныя прыстрэшкі.

Пасля перасялення дырэкцыі БНП вясной 2002 г. на новае месца павандравалі, па чарзе, бухгалтэрыя, гаспадарчае і будаўнічае аддзяленні, а на канец — у палове 2005 г. — каса. У будынку засталіся навуковая лабараторыя, бібліятэка, канцылярыі Асяродка зубрагадоўлі, Аховы парку, а таксама ахоўных абласцей Серханова і Дзядзінка. Тут надалей застаюцца ячэйка бяспечнасці і гігіены працы ды супрацпажарнай аховы, архіў і склад, а да паловы сакавіка 2008 г. заставалася яшчэ рэдакцыя „Księgi Rodowodowej Żubrów".

У заходняй частцы Маршальскага дома надалей утрымоўваюцца службовыя кватэры працаўнікоў БНП. Раней пражывалі тут м.інш. кіраўнікі белавежскіх навуковых установаў — прафесары Януш Б. Фалінскі, Здзіслаў Пуцэк і Аляксандр В. Сакалоўскі, д-р Станіслаў Бароўскі, дырэктар БНП Станіслаў Куявяк, кіраўнік Выдавецкага аддзялення Анджэй Антчак і вядомая экскурсавод ды турыстычная дзяячка Варвара Ева Высмулкова. Зараз жывуць тут м.інш. двух апошніх былых дырэктараў БНП — Чэслаў Аколаў і Юзэф Попель.

# Ушанавалі ікону Божай маці ў Жыровічах

Тэкст і фота Сяргея ЧЫГРЫНА



У мінулы аўторак, 20 траўня, тысячы праваслаўных вернікаў адзначылі свята Жыровіцкай іконы Божай Маці.

У гэты дзень у Жыровічах Слонімскага раёна было людна, як бывае там штогод. Людзі сюды завіталі з усіх куткоў Беларусі, а таксама з далёкага і блізкага замежжа. Завіталі, каб прысутнічаць на святых малебнах у гонар Багародзіцы.

Дарэчы, копія Жыровіцкай іконы Божай Маці ў пачатку траўня знаходзілася за межамі манастыра. У суправаджэнні святароў яна спачатку пабывала ў Гродне, а пасля — на адной з застаў Гродзенскага пагранатрада, дзе адкрываўся мемарыял у гонар воінаў Аўгустоўскага пагранатрада, якія загінулі ў першыя дні Другой сусветнай вайны.

Паданне, якое налічвае 538 гадоў, распавядае, што пад мястэчкам Жыровічы пастухі ўбачылі на дрэве яркае святло; яго выпраменьвала ікона Божай Маці. Выява была выразна бачна на невялікім камені, які лёгка ўмяшчаўся на далоні. Дзіўны быў далейшы лёс гэтай іконы: яна знікала і з'яўлялася зноў, гарэла ў полымі і вярталася да вернікаў непашкоджанай. Згубленую ў час пажару ікону вясковым дзецям зноў прынесла Дзева, акружаная такім жа таямнічым ззяннем. З таго часу вось ужо колькі стагоддзяў ікона захоўваецца ў Жыровіцкім праваслаўным манастыры.

Многія падзеі ў Жыровічах былі звязаныя з імем Аляксандра Солтана. Ён і лічыцца заснавальнікам праваслаўнай жыровіцкай святыні, якая і цяпер прыцягвае вернікаў. Слыннай яна была і застаецца не толькі ў Беларусі, але і ў Літве, Польшчы, на Украіне. На святочныя службы ў Жыровічы прыязджалі многія знакамітыя вяльможы Рэчы Паспалітай і нават каралі. Так, у 1644 годзе тут на багамоллі прысутнічаў кароль Уладзіслаў IV з жонкай, у 1651 годзе — кароль Ян Казімір, потым былі Ян III Сабескі з каралевічам Якубам, Аўгуст III, а ў 1784 годзе — Станіслаў Аўгуст Панятоўскі і іншыя асобы. Амаль усе госці, хто наведваў святыню, ахвяроўвалі ёй немалыя сродкі ці надзялялі прывілеямі. Гэта рабіла Жыровіцкі манастыр яшчэ больш багатым і слаўтым.

У Першую сусветную вайну абраз Жыровіцкай Божай Маці і ўся манастырская маёмасць былі вывезеныя ў маскоўскі сабор Васіля Блажэннага. Тым часам немцы там зрабілі казарму, пасеклі на дровы іканастас Нікольскай царквы... Але прайшоў час і святы абраз быў вернуты сюды на пачатку 20-х гадоў XX стагоддзя. Праўда, у Другую сусветную вайну манастыр зноў захапілі немцы, але яны нічога не пашкодзілі. Адступаючы, яны прадказвалі манахам кепскі лёс, калі тыя застануцца. Усё, аднак, абышлося. Адзінае, што за вызваленне Жыровічаў ніхто не атрымаў узнагароды. Людзі апавядаюць, што гэта здарылася таму, што камандзір падраздзялення, якое першым уступіла ў мястэчка, дазволіў намесніку манастыра, з нагоды вызвалення, адслужыць малебен і падзякаваць Госпаду за дараваную ім свабоду...

У 1991 годзе ў дзень святкавання Сабору Беларускіх святых Жыровіцкі манастыр і семінарыю наведаў святейшы патрыярх Маскоўскі і ўсяе Русі Алексій II. Госць узнагародзіў манастыр ордэнам Рускай праваслаўнай царквы, які названы імем прападобнага Сергія Раданежскага. Тады на сустрэчы ў семінарыі ішла гутарка пра тое, каб рыхтаваць для беларускага народа добрых пастыраў, глыбока адданых святой Праваслаўнай царкве і свайму народу, і якія ведаюць яго мову, сапраўдную гісторыю і культуру і гатовыя несці слова Божае людзям.

Праваслаўныя вернікі, католікі, уніяты заўжды бачылі ў Жыровіцкай Божай Маці сімвал пяшчоты, заступніцтва, выратавання і глыбока шанавалі за яе спрыяльную дапамогу. Ва ўсе часы нашай няпростай гісторыі (а сёння можа нават больш чым калі) усім нам так неабходныя гэтыя любоў, надзея і абарона ад ліха. Дык уратуй нас усіх, Прасвятая Багародзіца, і абарані!

## SLUCAK.ORG

незалежны сайт горада Слуцка ды рэгіёна

Горад Слуцк, што на Міншчыне, увайшоў у сучасную гісторыю Беларусі Слуцкім паўстаннем, што адбылося напачатку 20-х гадоў мінулага стагоддзя. Апантаныя ідэяй абароны толькі што народжанай БНР, мясцовыя жыхары са зброяй у руках узяліся за справу. На жаль, сілы ўсходніх і заходніх суседзяў аказаліся значна мацнейшымі, і паўстанне захлынулася, пакінуўшы, тым не менш, добрую памяць аб сабе ў людзей, якім баліць душа за дэмакратыю ў Беларусі, годнае яе існаванне ў сучасным свеце.

Было б дзіўна, калі б сёняшнія слуцкія нашчадкі змагароў пачатку мінулага стагоддзя не выкарыстоўвалі інтэрнэт, каб хоць якім-кольвечы чынам не заявіць аб сабе. Пэўна з такіх прычын і ўзнік сайт „Слуцак", які месціцца ў сусветным павуцінні па адрасе http://slucak.org.

Пра тое, што „Слуцак" — незалежны сайт горада Слуцка ды рэгіёна мы даведваемся адразу, калі адкрыем першую старонку. Агульнае ж уражанне ад сайта даволі добрае. Разумееш, што ён быў створаны хутчэй за ўсё аматарамі, якія марылі аб тым, каб іх родны горад і іх думкі аб яго жыцці сталі вядомыя інтэрнэтнай супольнасці.

Першая „слуцкая" старонка падзелена на традыцыйныя тры часткі. Пасярэдзіне, як і мае быць, месяцца анонсы навінных паведамленняў. Вянчае іх кідкая адозва „Свабодная Беларусь — цвярозая Беларусь — спынім генацыд". З такой адозвы трэба разумець, што стваральнікам і натхняльнікам сайта залежыць на тым, каб людзі ў Беларусі вялі цвярозы лад жыцця, не паддаваліся на спакусы „зялёнага змія". Што тут скажаш — вечная барацьба з вечнымі спакусамі.

У той жа час далёка не вечнай з'яўляецца барацьба дэмакратычных актывістаў за лепшую будучыню Беларусі. І аб гэтай барацьбе добра распавядаецца ў рубрыцы „Навіны". Менавіта адсюль мы можам даведацца пра абставіны нядаўняга візіту Аляксандра Мілінкевіча ў Слуцк, яго затрыманні і перaслед.

Слуцк — горад невялікі. Таму, зразумела, працу людзям там знайсці цяжка. Не дзіўна, што нядаўнае закрыццё слуцкай тэкстыльнай фабрыкі і адпаведнае звальненне 135-ці працаўнікоў — вялікая непрыемная падзея для случчан. І ўсё прытым, што гэтыя мясціны здаўна славіліся сваімі вырабамі лёгкай прамысловасці — дастаткова згадаць непаўторныя слуцкія паясы.

Вельмі цікавай з'яўляецца рубрыка „Артыкулы". Найбольшую каштоўнасць надае ёй, так бы мовіць, слуцкая арыентаванасць змешчаных у ёй матэрыялаў, якіх не знойдзеш ні ў якіх іншых медыях.

Тым, хто не ведае, што гэта за такі горад Слуцк і дзе ён знаходзіцца, варта будзе зазірнуць на старонку „Горад". Тут у даволі прывабнай форме месцяцца выцрымкі з храналогіі гісторыі Слуцка. Праўда, з большага яны тычацца сівой даўніны. Аб падзеях нядаўняга мінулага звестак няма. Думаецца, што гэты недахоп распрацоўшчыкі і аўтары сайта выправяць бліжэйшым часам.

Калі вярнуцца да першай старонкі і паглядзець на яе правы бок, то ўбачым, што „Слуцак" помніць аб палітычных вязнях — яго аўтары заклікаюць наведвальнікаў напісаць лісты за краты на імя Андрэя Кіма і Аляксандра Казуліна.

**Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ**

## СПОРТ

# Беларусь,беларусы...

**Неўміручая справа „кратоў"**

Як і прагназавалася, першая на тэрыторыі постсавецкай прасторы, гучная крымінальная справа, якая датычылася карупцыі ў футболе, ціхенька пад грыфам „за тэрмінам даўнасці" пахаваная на бяскрайніх прасторах Сібіры. У 2005 годзе рэдакцыя беларускай спартовай газеты „Прессбол" перадала ў Генеральную пракуратуру Беларусі матэрыялы, якія ляглі ў аснову артыкула „Аперацыя «Крот»", што быў надрукаваны годам раней. Гутарка ідзе пра подкуп ажно адборавых матчаў чэмпіянату Еўропы Беларусь — Чэхія і Малдова — Беларусь, якія адбыліся ў 2003 годзе. Распачатая крымінальная справа цягам двух далейшых гадоў то разгаралася, то згасала. Вакол яе адбывалася дзіўная мітусня, следчыя валаводзіліся, а іншая афіцыйныя асобы давалі супярэчлівыя і непаслядоўныя каментарыі. Было зразумела, што некаму ў „вярхах" (можа і вельмі высока) наступілі на лапу. Урэшце ў красавіку 2007 года аб'яўленаму ў вышук былому галкіперу зборнай Беларусі Валерыю Шанталосаву, паводле артыкула 253 Крымінальнага Кодэкса Рэспублікі Беларусь, завочна зрабілі абвінавачанне ў спробе „подкупу ўдзельнікаў прафесійных спаборніцтваў". Сутнасць справы была ў тым, што былы футбаліст зборнай напярэдадні гульні з чэхамі прыязджаў на базу нацыянальнай дружыны і прапаноўваў іншаму брамніку Генадзю Туміловічу значную суму долараў за тое, каб той забяспечыў патрэбны вынік. Туміловіч ад ганебных грошай катэгарычна адмовіўся, але зборная Беларусі ўсё роўна прайграла з адпаведным лікам (магчыма, што і натуральна, а магчыма знайшоўся іншы „выканаўца"). Гісторыя паўтарылася ў Малдове, калі ў гатэль да Туміловіча (напэўна не толькі да яго, але іншыя маўчаць) нявяўся скандальны расійскі журналіст (насамрэч, хутчэй махляр і аферыст) Міхаіл Пукшанскі, „партнёр" Шанталосава. Па ўсім відаць, што „партнёры" адначасна падманвалі і адзін аднаго. І зноў камандa Беларусі ў выніку саступіла з патрэбным лікам.

Сам Шанталосаў, які кінуў працу ў Беларусі, пасля абвінавачання заявіў, што цяпер ён грамадзянін Расіі і спакойна ад'ехаў у Новасібірск. У сакавіку 2008 года тры тамы крымінальнай справы з Беларусі былі перададзены на ўсход. Праз нейкі час ужо расійскае следства пастанавіла, што сваімі дзеяннямі Шанталосаў здзейсніў злачынства, у праўнай тэрміналогіі „пасяганне на злачынства (...) — подкуп спартоўца прафесійных спартовых спаборніцтваў", прадугледжанае Крымінальным Кодэксам Расійскай Федэрацыі. Сабраныя доказы навасібірскі следчы палічыў дастатковымі для абвінавачання, але... Той жа пастановай крымінальная справа была зачыненая — з фармулёўкай „за тэрмінам даўнасці". Вось такая юрыдычная эквілібрыстыка.

Пару месяцаў таму ў цягніку давялося мне выпадкова пазнаёміцца з адным былым украінскім футбалістам, які цяпер з'яўляецца агентам маладых гульцоў. Шматгадзінная гутарка на тэму любімай гульні была насычанай успамінамі і шчырай па змесце. Але як толькі я запытаўся ў суразмоўцы пра справу Шанталосава, той замкнуўся і, загадкава ўсміхнуўшыся, прамовіў: „Пра гэта і гэтаму падобнае я мог бы расказаць многа, але ні я, ні хто іншы вам нічога не скажа". Карпаратыўная салідарнасць і страх стрымліваюць амаль усіх, ад каго залежыць маральная чысціня футбола. Значыць, чорная справа „кратоў" жыве.

**Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ**

# Лепш пазней, чым ніколі...

**Васіль ПЕТРУЧУК**

... але бяруся адказаць на артыкул Анатоля Маўчуна пад загалоўкам „Закон для чалавека, ці чалавек для беззаконня?” („Ніва” ад 10.03.2008 г.). Тут хачу коратка сканстатаваць на спосаб, які між іншым і мяне датычыць: законы бываюць розныя і па-рознаму іх прымяняюць. Але цяпер пануе такі закон, які ўвёў менавіта беззаконне. Прыклад: ведаюць Бог і людзі аб тым, што ў межах сённяшняй Польшчы існавала ПНР — Польская Народная Рэспубліка, якую прызнаў увесь свет, з якім утрымлівала яна рознага тыпу стасункі, у гэтым ліку і дыпламатычныя. У такім выпадку мела яна права на сваю армію, міліцыю, разведку, контрразведку, пракуратуру, суды і ўсё тое, чым карыстаецца нармальная праўвая дзяржава. Гэта больш-менш, бо ж не буду тут даваць лекцыю.

Тым часам пасля перавароту Салідарнасці ўзяліся за дэкамунізацыю, люстрацыю і дэубекізацыю. Раптам ВСІ, СБ, МО, Пракуратура і Суд сталі ворагамі радзімы. Ага, ПАРП — таксама, але ў іншы спосаб — ідэалагічны. А ўсе працаўнікі МБП, МО, разведкі, нават вонкавай, і контрразведкі сталі ворагамі Польшчы і палякаў. Замест прымяняць права і судзіць тых, хто працуючы ў розных легальных органах дапусціліся злачынства, то яны ўвялі сваё беззаконне, увапхнулі ў адзін мяшок усіх і нават тых, хто адразу з фронту быў накіраваны ў органы дзяржаўнай бяспекі, наспех арганізаваныя супраць бандаў, якія нас з вамі хацелі выгнаць з Польшчы, а калі не, дык выпаліць і вымардаваць, і пазбавілі ветэранскіх прывілеяў.

Вось кароткі адказ А. Маўчуну на загаловак ягонага артыкула. А цяпер адносна канкрэтна, чаму такое пытанне паставіў Анатоль Маўчун. Ён напісаў: „У „Часопісе” н-р 1/08 спадар Васіль Петручук у сваіх „Крышынках” закранае цікавую тэму. На пачатак прыгадвае, што ў 1917 годзе нямецкія ўлады адчынілі ў сёлах школы для нацыянальных меншынь з іх роднымі мовамі навучання. Заўважае, што ў Грабаўцы адчынілі школу з беларускай мовай, але тую школу пасля адраджэння Польшчы палякі ў 1919 годзе ліквідавалі. Пра гэта В. Петручук пісаў ужо некалі ў „Ніву”, але ні раней, ні цяпер аб праблемах беларускага школьніцтва ў Польшчы дакладней нічога не сказаў. Шкада”. Магчыма, цытата даўгаватая, але адказ будзе кароткі.

Спадар Анатоль, я ніколі не прэтэндаваў на тое, каб даць ацэнку беларускаму школьніцтву ў Польшчы, бо я некампетэнтны ў гэтай справе. Але дастаткова аб гэтым у публікацыях Ежы Тамашэўскага і Юрыя Туронка, ды і іншых. Маёй мэтай было паказаць імкненні польскіх „дэмакратаў” да прыгнёту, а то і ліквідацыі нацыянальных меншынь, з іх рэлігіяй. Прыкладам няхай паслужыць тое, што ў 1938 годзе „справядлівыя”, „спачувальныя” і „багабаязныя” сілы палякаў спалілі 130 праваслаўных храмаў, а вось і гэты маленькі здымак басаногай дзятвы, да якой і я належаў за „вялікапышнай санацыйнай раскошы”.

*Беласток, 16 мая 2008 г.*

PS. Яшчэ па прычыне склератычнага крызісу забыўся паставіць сябру Анатолю Маўчуну вось такое пытанне: чаму немцы ў час І вайны дбалі пра гэта, каб заслужыць прыхільнасць беларускага народа ў Польшчы, а палякі гэтага не захацелі? Я сваю канцэпцыю ведаю, але „каву на лаву” не пастаўлю. Няхай кожны думае, што хоча. Гэта адно. А калі хто не ведае як да гэтага ўсяго паставіцца, дык няхай звернецца да складу мышлення такіх „герояў”, якіх цяпер узнагароджваюць найвышэйшымі ордэнамі і выплачваюць ім вялікія сумы грошай. Затое на іх ахвяры кладуць вялікую дубіну!

**В. П.**

## ВІНШАВАННЕ

28 мая здзейснілася
30-я гадавіна
душпастырскай паслугі
**а. Славаміра
Тафілюка**
*— настаяцеля прыхода
ў Юшкавым Грудзе.*

*Шчырыя віншаванні
і найлепшыя пажаданні
з гэтай нагоды выказваюць прыхаджане
Юшкаўскага прыхода,
а ў іх ліку Віктар Бура
з сям'ёю.*

# Супольная гісторыя

**Андрэй ГАЎРЫЛЮК**

Калі сустракаюся з прафесарам Мечыславам Яцкевічам, заўсёды гутарым па-беларуску — ці то ідучы па тратуары, ці то едучы на аўтобусе. І вось нядаўна прафесар Яцкевіч запрасіў мяне ў Цэнтр усходніх даследаванняў пры Асяродку навуковых даследаванняў імя Войцеха Кэнтшынскага ў Ольштыне, дзе ён працуе праграмным каардынатарам. Цэнтр многа ўвагі адводзіць навуковым і культурным сувязям з нашымі ўсходнімі суседзямі.

11 сакавіка г.г. адбылася там сустрэча з прафесарам Аляксандрам Краўцэвічам з Гродна на тэму „Між Еўропай і Расіяй — дылемы Беларусі”. 3 красавіка з дакладамі на тэму гістарычных і сучасных польска-літоўскіх сувязей выступілі Альвідас Нікжэнтайціс і Аўдрыюс Жуліс. 17 красавіка з лекцыяй на тэму праваслаўя ў Польшчы ў пасляваенны перыяд выступіў Раман Плонскі.

24 красавіка выступіў Вацлаў Радзівановіч, карэспандэнт „Выбарчай газеты” ў Маскве. Гаварыў ён пра шырокі спектр праблем сучаснай Расіі ў міжнародным аспекце. Сказаў ён, м.інш., што ёсць падазрэнні, быццам Расія трымае забароненыя еймі міжнароднымі дамовамі ракеты ў Калінінградскай акрузе. Сам дакладчык аднёсся з недаверам да такой магчымасці, аднак адзначыў, што такія ракеты ёсць у іншым недалёкім месцы, а менавіта каля Баранавіч у Беларусі, але ў сённяшні час месцазнаходжанне ракетных установак не вельмі істотнае. Гэта можа быць элементам нейкай палітычнай паказухі, вынікаючай з пачуцця пакрыўджанасці, што ранейшыя абшары савецкай дамінацыі займае НАТО. Некаторай асалодай гэтай крыўды можа быць прысутнасць Расіі ў групе найбагацейшых дзяржаў G-8, але на гэтую прысутнасць можна толькі паўсміхацца, бо ў эканамічным сэнсе Расія, напр., пятнаццацікратна слабейшая за Еўрасаюз. Расейцы дэмакратыю лічаць беспарадкам; гэта нават у пэўным сэнсе з'яўляецца праўдай, бо дэмакратыю можна назваць упарадкаваным хаосам. Толькі мы хочам той хаос парадкаваць, а ў Расіі дэмакратыя асацыюецца з беспарадкам эпохі Ельцына.

8 мая даклад на тэму „Міф Літвы ў польскай культуры” зачытаў Кшыштаф Бухоўскі з Беластока. Даклад быў цікавы, усім прысутным спадабаўся. Да чарговых сустрэч у Асяродку навуковых даследаванняў!

# Адгаданка

**Шыфраграма**

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць рашэнне — дацкую прыказку.

1. мужаў брат = 22 _ 23 _ 21 _ 24 _ 25 _ 26 _;
2. заменнік скуры: насычаная спецыяльным рэчывам тканіна з кручаных нітак = 38 _ 39 _ 34 _ 1 _ 2 _;
3. моцны, рэзкі гук голасу = 13 _ 14 _ 15 _ 7 _;
4. зімовы месяц = 8 _ 9 _ 5 _ 6 _;
5. вузкая паласа, лінія = 30 _ 27 _ 20 _ 31 _;
6. участак садавода = 37 _ 35 _ 12 _;
7. усходні ласунак, спрасаваная салодкая маса з расцёртых арэхаў, семечак сланечніку... = 40 _ 4 _ 3 _ 16 _ 17 _;
8. гарбата = 10 _ 11 _ 36 _;
9. Васілій, бальшавіцкі герой грамадзянскай вайны ў Расіі (1887-1919) = 32_ 33 _ 29 _ 28 _ 18 _ 19 _.

| | | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 |
| | | 11 | 12 | 13 | 14 | 15 | 16 | 17 | 18 | 19 | 20 | 21 |
| | | | | | | | 22 | 23 | 24 | 25 | 26 | 27 |
| 28 | 29 | 30 | 31 | 32 | 33 | 34 | 35 | 36 | 37 | 38 | 39 | 40 |

**(ш)**

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя адказы, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

**Адказ на адгаданку з 17 нумара**

Крапіва, лаўра, Ашхабад, Пінск, карнавал, Дуісбург, май, спеў, тракт, Енісей, Буг, Парыж, крэм.

Рашэнне: **Калі кажаш праўду, трымай нагу ў стрэмені.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Казіміру Радошку** са Свебадзіцаў і **Лукашу Пацэвічу** з Беластока.

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714
**Выдавец**: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва”.
**Старшыня**: Яўген Вапа.
**Адрас рэдакцыі:** 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 84.
**Тэл./факс:** (+48 85) 743 50 22.
**Internet**: *http://niva.iig.pl/*
**E-mail**: *redakcja@niva.iig.pl*
*Zrealizowano przy udziale wsparcia finansowego Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.*

**Галоўны рэдактар:** Яўген Вапа.
**Намеснік гал. рэдактара:** Віталь Луба.
**Тэхнічны рэдактар:** Адам Паўлоўскі.
**Рэдактар „Зоркі”:** Ганна Кандрацюк-Свярубская.
**Публіцысты:** Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч.
**Канцылярыя:** Галіна Рамашка.
**Камп'ютэрны набор і карэктура:** Яўгенія Палоцкая.
**Друкарня**: „Orthdruk”, Białystok.

Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.

**Prenumerata:** III kwartał 26 zł. do 5 czerwca 2008 r; IV kwartał 26 zł. do 5 września 2008 r. II półrocze 52 zł. do 5 czerwca 2008 r. II — IV kwartał 78 zł. do 5 marca 2008 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch” na terenie całego kraju.

Prenumerata z wysyłką za granicę **pocztą zwykłą** wynosi: kwartalna — 131 zł.; półroczna — 224 zł.; roczna — 374 zł. **Pocztą lotniczą**: Europa — prenumerata kwartalna — 142 zł., półroczna — 243 zł., roczna — 405 zł. Ameryka Północna, Południowa, Środkowa, Afryka, Azja — prenumerata kwartalna — 160 zł., półroczna — 274 zł., roczna — 456 zł. Australia i Oceania — prenumerata kwartalna — 204 zł., półroczna — 350 zł., roczna — 583 zł.

Wpłaty do 5 dnia miesiąca poprzedzającego prenumeratę przyjmuje „RUCH” S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A. IV O/ Warszawa,

Nr 68 1240 1053 1111 0000 0443 0494.

Prenumeratę można zamówić w redakcji. Planowana ilość numerów „Niwy” w 2008 roku — 52. **Poczta zwykła:** Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,55 zł. Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę — kraje europejskie — 5,00 zł. — kraje pozaeuropejskie — 5,20 zł. **Poczta lotnicza:** Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę: — kraje europejskie — 6,00 zł, — Ameryka Północna, Afryka — 6,70 zł., — Ameryka Południowa — 7,80 zł., — Australia i Oceania — 10,00 zł.

Wpłaty przyjmuje: Rada Programowa Tygodnika „Niwa”, BANK PEKAO S.A. O/Białystok 38 1240 5211 1111 0000 4929 0945

**Nakład**: 1 750 egz.





# 01.06 — 07.06

**(22.03. — 20.04.)** Знакамітая першая дэкада месяца! Будзеш моцны, падзейнічаеш з поспехам. Сваім энтузіязмам падмацуеш іншых. У рабоце няма табе роўных! Шчаслівыя парывы сэрца (увесь месяц).

**(21.04. — 21.05.)** Будзеш спраўны і прадпрымальны. Творча падыдзеш да праблем, кожную паразу перакуеш у поспех. У каханні выкажы большую ініцыятыву.

**(22.05. — 22.06.)** 5-9.06 будзеш асабліва падабацца. Сімпатыя атачэння, выдатна ў фінансах. Бярыся афармляць найцяжэйшыя справы. Паставіш на чорнага каня! — маеш цяпер выдатны нос да інтарэсаў.

**(23.06. — 23.07.)** Да закахання — адзін крок. Дарэчы, не спыніш кахання, якое з імпэтам уварвецца ў тваё жыццё! У прафесійных справах разлічвай толькі на сябе. Засяродзься на адной найважнейшай справе на працы.

**(24.07. — 23.08.)** Вялікая сіла ад Марса. Дома шмат змен. Твая пара патрабуе ажыўляльнага імпульсу. Калі хочаш штосьці змяніць, пачні ад сябе. Пазбягай лёгкіх вырашэнняў.

**(24.08. — 23.09.)** Шанц выказацца ў інтарэсах. Найлепшы момант на справы, якія патрабуюць канцэнтрацыі і ахвярнасці. Смела рэалізуй свае прафесійныя задумы. Не ўстрымаеш усіх эмоцый і пачуццяў!

**(24.09. — 23.10.)** 4-9.06 будзеш мець ахвоту, каб цябе здабывалі — будзеш спакушаць, прыцягваць, аж свае здабудзеш! Шэф пахваліць. Варта выбрацца ў падарожжа (найлепш у дзве першыя дэкады месяца) — гарантаваныя файныя прыгоды!

**(24.10. — 22.11.)** Калі хочаш расстацца, зрабі гэта хутка і без цырымоній, будзе менш балець. Вялікія буры ў пары. Калі не паддасіся спакусам, можаш хутка ўзбагацець. Апетыт на багацце будзе расці з усё большымі грашыма!

**(23.11. — 22.12.)** Маладзік Месяца (3.06.) дазволіць адкрыць табе новы раздзел у тваім пачуццёвым жыцці. Знакаміты час на заручыны. З 5.06. асцерагайся з рызыканцтвам у фінансавых рашэннях. Не ангажуйся замоцна ў апантаныя пачуцці — гэта можа нават напалохаць любую табе асобу!

**(23.12. — 20.01.)** У пары ідэальная гармонія. Для сям'і ты гатовы зрабіць усё. Будзеш моцна заняты на працы. Самотныя Казярогі пяроймуць ініцыятыву і рушаць на паляванне. Нерспадзявана можаш зарабіць шмат грошай.

**(21.01. — 19.02.)** 3.06. — найлепшы час пачаць курсы на вадзіцельскія правы. Будзеш кемлівы, зробіш добрае ўражанне. Будзеш душой кампаніі, завіруе навокал цябе шмат аматараў. Можаш адкрыць у сабе талент, дзякуючы якому паможаш іншым.

**(20.02. — 21.03.)** Не міне цябе страла Амура! Калі ты ўжо закальцаваны, узмоцніцца сувязь у тваёй пары. На працы пакажаш прыклад тым, хто заўжды не паспявае. Не будзь запальчывым і неасцярожным — зважай на здароўе (увесь месяц)! Празмерныя эмоцыі разгрузі фізкультурай.

**Агата АРЛЯНСКАЯ**

ISSN 0546-1960